PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2458) Год XLVIII | Беласток, 22 чэрвеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

## Пабаяліся Еўрасаюза

Пасля эйфарыі кіраўнікоў краіны ад станоўчага рэзультату рэферэндуму па далучэнні Польшчы да Еўрапейскага Саюза, які адбыўся 7-8 чэрвеня, пачаўся аналіз вынікаў на месцах. Беластоцкія сродкі масавай інфармацыі кінуліся высвятляць прычыны малога зацікаўлення жыхароў Падляшскага ваяводства, а асабліва яго паўднёва-ўсходняй часткі, еўрасаюзным рэферэндумам.

У Падляшскім ваяводстве на выбарчыя ўчасткі з'явілася 52,71% выбаршчыкаў, з ліку якіх 68,63% выказаліся за далучэнне краіны да ЕС, а 31,37% — супраць (у маштабе краіны гэтыя паказчыкі былі намнога лепшыя — адпаведна: 58,85%, 77,45% і 22,55%). Большае зацікаўленне рэферэндумам наглядалася ў гарадах, на вёсках было яно меншае і звычайна не перасягала 50-працэнтнай яўкі. Так было ў Бельскім, Гайнаўскім і Сямятыцкім паветах, дзе правам удзелу ў рэферэндуме пакарысталася адпаведна 46,93%, 43,47% і 43,38% грамадзян. Найменш выбаршчыкаў, бо толькі 28%, галасавала ў Арлянскай гміне Бельскага павета — гэта самы нізкі паказчык у маштабе краіны.

Хаця ў агульным разліку еўраэнтузіясты перамаглі еўраскептыкаў, аднак на паасобных участках было і наадварот. Напрыклад, у Новым Корніне Гайнаўскай гміны 61 выбаршык выказаўся за далучэнне да ЕС, а 94 былі супраць, а ў Курашаве Чыжоўскай гміны „так" на выбарчых бюлетэнях пазначылі 106, а „не" — 123 асобы.

Чаму да рэферэндуму з насцярожанасцю паставіліся жыхары ўсходняй Беласточчыны, у пераважнай большасці беларусы праваслаўнага веравызнання, традыцыйны электарат СЛД — кіруючай краінай партыі, якая завяршае працэс далучэння да ЕС? У асноўным гэта вынік складанага эканамічна-сацыяльнага становішча. Нізкія цэны на сельгаспрадукцыю, клопаты з яе збытам, беспрацоўе, цывілізацыйная адсталасць, якая стала яшчэ паглыбляцца, напрыклад, у выніку скарачэння публічнага транспарту, выклікаюць пачуццё бязвыхаднасці, бесперспектыўнасці. Свядомасць таго, што з моманту ўваходу ў ЕС становішча адразу не адменіцца, што чакае нас шматгадовы працэс рэфармавання, які можа яшчэ ўскладніць і так цяжкую сітуацыю, што стануць жыць лепш, мабыць, дзеці або ўнукі адбівала ахвоту пайсці на рэферэндум.

„Найгорш пераканаць земляробаў, — сказаў „Ніве" (№ 19 ад 11 мая г.г.) гімназіст з Гарадка, сябра Еўрапейскага школьнага клуба. — Людзі паўтараюць міфы, што Еўропа забярэ нам працу, чужаземцы выкупяць зямлю, а на нашы мірныя вёскі і мястэчкі нахлыне зло з Захаду".

Аказваецца, не пераканалі.

Віталь Луба

Фота Міры Лукшы

*У цэнтры — „бацька «Белавежы»" — Георгій Валкавыцкі. Злева — Жэня Мартынюк (Бельск-Падляшскі), справа — Алена Анішэўская (Варшава)*

## „Белавежы" — 45

Роўна 45 гадоў таму, у сонечную чэрвеньскую нядзелю, таксама 8 чысла, сабраліся былі маладыя пачынальнікі літаратурнага руху на пасляваеннай Беласточчыне. Згуртавалі іх „Ніва" і Георгій Валкавыцкі. Былі тады, на заснавальным сходзе літаратурнага аб'яднання (тады яшчэ без „белавежскай" назвы), маладзенькія Янка Чыквін, вучань бельскага белліцэя, сціплы Сакрат Яновіч, які нават сеў быў збоку, Віктар Швед, Алесь Баршчэўскі, Валодзя Гайдук... Пабачыць іх можна на першых здымках у фотальбоме „Беларускае літаратурнае аб'яднанне «Белавежа». 1958 — 2003 гг. у фатаграфіі", заадно прысвячэнню „бацьку «Белавежы»" Георгію Валкавыцкаму на плённае васьмідзесяцігоддзе. З хваляваннем глядзелі архіўныя ўжо здымкі на юбілейнай сустрэчы 8 чэрвеня 2003 г. у Беластоку члены літаб'яднання, сярод якіх ужо няма некалькіх сяброў, і госці — дакладчыкі з Польшчы і Беларусі, якія грунтоўна разглядалі творчасць некалькіх „белавежцаў" ды „белавежскага" гадавіка „Тэрмапілы", які стаў часопісам творчых беларусаў з усіх бакоў свету. Першы раз да творчасці „белавежцаў" прыклаліся мовазнаўцы. Усе даклады — Галіны Твараповіч (Беласток) — „Стылёва-эстэтычныя асаблівасці беларускай літаратуры ў Польшчы", Вольгі Шынкарэнкі (Гомель) — „Георгій Валкавыцкі пра сябе і свет", Пятра Васючэнкі (Мінск) — „Абрысы мастацкага свету Сакрата Яновіча", Людмілы Сіньковай — „Чалавек і гісторыя ў мемуарах Янкі Жамойціна", Галіны Тычкі (Мінск) — „Проза Міхася Андрасюка: пошукі новых шляхоў мастацкага асэнсавання жыцця", Алеся Макарэвіча (Магілёў) — „Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы Міры Лукшы", Ванды Супы (Беласток) — „Sformułowania uogólniające w prozie Sokrata Janowicza", Базыля Сегеня (Беласток) — „Дыялектнае слова ў творчасці «белавежцаў» (С. Яновіч, В. Петручук, З. Сачко)", Зоі Мельнікавай (Брэст)— „Часопіс «Тэрмапілы» і сучасны беларускі літаратурны працэс", Алы Брадзіхінай (Гомель) — „Пошукі ісціны. Сімультанізм пачуццяў у творчасці Яна Чыквіна", Анатоля Раманчука (Гродна) — „Лірыка Міхася Шаховіча" — будуць надрукаваны ў новым нумары „Тэрмапілаў", які пакажацца ў жніўні-верасні.

Сярод гасцей на ўрачыста-працоўнай сустрэчы былі прысутныя старшыня Беларускага саюза ў РП, таксама „белавежац" Яўген Вапа, і Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ, член ваяводскай самаўрадавай управы, пісьменнік з Беларусі Анатоль Кудравец ды чытачы.

— Творчая гісторыя „Белавежы", тая, утрываленая даўжынёю ў сорак пяць гадоў, напоўнена літаратурнымі фактамі, насычана падзеямі, перасыпана сустрэчамі, ліставаннем, семінарамі, аўтарскімі вечарынамі, — успамінае ва ўступе ў фотаальбом старшыня Ян Чыквін. — І, што самае істотнае, выяўляе ўзрастанне і сталенне яркіх творчых індывідуальнасцей... „Белавежа" зведала таксама і радасць творчых поспехаў, пераможны выхад у шырэйшы свет, урэшце, прызнанне крытыкі і чытацкую ўдзячнасць. Так, шматжанравую творчасць „белавежцаў" здаўна даследуюць, іх кнігі перакладаюць на іншыя мовы, яны запатрабаваны чытачом. Многія творы беларускіх пісьменнікаў Польшчы ўвайшлі ў школьныя падручнікі і вывучаюцца ў агульным кантэксце беларускай літаратуры...

Міра Лукша

## Вёска ў сённяшняй і будучай Еўропе ☞ 3

У гайнаўскім магістраце з нямецкай дэлегацыяй спаткаліся гаспадары з Гайнаўскага павета. Ганс Фрыдрыхсен, старшыня лакальнага Саюза гаспадароў расказаў пра сваю сельскагаспадарчую дзейнасць і яе вынікі. Гаспадараць ён на 100 гектарах лугоў, 50 гектарах ворыва, гадуе 300 штук быдла і свіней. Прадае за год каля 600 тысяч літраў малака і збірае ў сярэднім па 5-8 тон збожжа з гектара.

## Нямецкая акупацыя Беларусі ☞ 4

Акупанты пакуль прыйшлі ў Беларусь ведалі ўсё пра людзей, якія жылі на гэтай тэрыторыі. У 1941 г. немцы апрацавалі гісторыю Беларусі ад ранняга сярэднявечча па сучасныя ім дні. Ведалі яны не толькі пра публічнае, але таксама прыватнае жыццё беларускіх дзеячаў, пражываючых у БССР, II Рэчы Паспалітай і ў эміграцыі.

## Пасляэферэндумная ўражлівасць ☞ 4

Заўважыў я, што і заходні свет глядзеў на наш рэферэндум, але не ацэньваў гэту падзею ў палітычных катэгорыях. Амерыканская тэлестанцыя і брытанская спалучылі рэферэндум у Польшчы з эканамічнымі навінамі. Пэўна, мелі рацыю, бо лёсы еўрапейскай супольнасці будуць вырашаць гаспадарка і эканоміка.

## У дарослы свет ☞ 5

Жонка пасла РБ Наталля Латушка засяродзілася на спецыяльнай узнагародзе, якую Пасольства РБ у Варшаве вырашыла штогод прызначаць аднаму вучню Гайнаўскага ліцэя, які найбольш дзейнічае на ніве беларускай культуры. Сёлета гэтае вылучэнне атрымала Аліцыя Леанюк.

## Узнагарода за місіянерскую дзейнасць ☞ 9

У час гала-канцэрта Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі мітрапаліт Анастасіас — архіепіскап Тыраны, Дураса і ўсёй Албаніі быў узнагароджаны ордэнам „Ессе Homo". Узнагароду мітрапаліт атрымаў за місійную і дабрачынную дзейнасць у Афрыцы і Албаніі.

## Перад Богам стае не з пустымі рукамі ☞ 10

28 мая развіталіся мы з Мікалаем Нестаровічам, адным з вядучых у Польшчы кінааператараў-дакументалістаў, шматгадовым супрацоўнікам Польскага тэлебачання. Памёр ён ва ўзросце 62 гадоў. Да канца свайго жыцця аставаўся верным паклоннікам Беластоцкай зямлі.

# Беларусь — беларусы

## Хто абароніць помнікі?

У Беларусі вядзецца пастаянная вайна з помнікамі. Рукамі невядомых вандалаў апаганьваецца памяць аб загінуўшых падчас бурлівых падзей мінулага стагоддзя.

Сёння можна выдзяліць два падыходы да помнікаў з боку беларускіх улад. Першы — вельмі паважны, ён тычыцца абеліскаў загінуўшым у часы II сусветнай вайны змагарам з нямецкім фашызмам. Амаль у кожным населеным пункце Беларусі вы знойдзеце такі помнік. Звычайна ён добра дагледжаны. Канешне, бываюць выключэнні, але яны толькі пацвярджаюць правіла — у гэтых помніках адчуваецца сапраўдная патрэба. Дарэчы, не толькі мясцовай і вышэйшай улады, а і звычайных людзей.

У той жа час ёсць помнікі, да якіх стаўленне з боку сённяшняга беларускага кіраўніцтва, мякка кажучы, не асабліва трапяткое. Гэта тычыцца мемарыяльных знакаў у памяць аб рэпрэсіраваных за сталінскімі часамі ні ў чым не павінных ахвяр. Аб падзеях вакол мемарыяла Курапаты, што пад Мінскам, распавядалася многа. Дэмакратычныя арганізацыі і незалежныя сродкі масавай інфармацыі спрабуюць прыцягнуць увагу ўсёй грамадскасці да яго праблем, але і дагэтуль само існаванне мемарыяла застаецца пад пытаннем. Калі раней невядомыя варвары ламалі і вырывалі з зямлі ўсталяваныя ва ўрочышчы крыжы, то апошнім часам узнікла пагроза звычайнай забудовы месцаў злачынных расстрэлаў. Праблема ў тым, што і дагэтуль афіцыйна не вызначаны ахоўныя зоны вакол „месца знішчэння ахвяр палітычных рэпрэсій 30-40 гадоў" і таму, зважаючы на блізкасць ад Мінска, у тамтэйшым наваколлі не супраць пасяліцца тым, для каго памяць аб нявінна закатаваных пусты гук. Але як аказваецца і для мясцовай мінскай улады слова „Курапаты" няшмат значыць, калі яна не прыслухоўваецца да гісторыкаў і тых людзей, якія па закліку свайго сумлення пільнуюць мемарыял ад хуліганаў, наводзяць у ім чысціню, рамантуюць паламаныя крыжы. Будаўніцтва катэджнага пасёлка „Сонечны", дзе маюць пасяліцца багацеі, пакуль прыпыненае. Сталася гэта дзякуючы намаганням „абаронцаў Курапатаў". Але і цяпер не спыняюцца здзекі з помнікаў. Мінулым месяцам ужо ў другі раз была паламаная так званая „лаўка Клінтана" — памятны знак з надпісам „Ад народу Злучаных Штатаў Амерыкі". Паколькі беларускія ўлады не могуць захаваць бяспеку помніку, амерыканскае пасольства прапануе перавезці помнік на сваю тэрыторыю.

Нешта падобнае адбылося і з мемарыялам ахвяр Галакоста „Яма". На месцы мемарыяла ў часы вайны было размешчанае мінскае яўрэйскае гета, дзе фашысты забілі больш за 100 тысяч чалавек. Напрыканцы мая невядомыя антысеміты ля ўвахода на памятны комплекс намалявалі свастыку і зрабілі надпісы „Галакост 2003" і „Бей жидов". Па словах кіраўнікоў яўрэйскіх арганізацый, за такія дзеянні, якія, дарэчы, адбываліся і раней, ніхто ў Беларусі пакараны не быў. „Беларускія ўлады робяць выгляд, што ў нас нічога не адбываецца", — сказаў віцэ-прэзідэнт Саюза беларускіх яўрэйскіх арганізацый і абшчын Якаў Басін. Затое на падзею адгукнуліся афіцыйныя прадстаўнікі замежных дзяржаў. Паслы краін Еўрасаюза адмыслова, каб паказаць сваю салідарнасць з мясцовымі яўрэямі, наведалі месцы звязаныя з падзеямі ў мінскім гета і будынкі былых сінагог. Выпадак беспрэцэдэнтны, бо ў іншых краінах паслы чамусьці не вымушаны засяроджваць увагу мясцовай грамадскасці і ўлад на такой, здавалася б, унутранай праблеме.

Такая сітуацыя, вядома, сорам для Беларусі. Але ці можа быць інакш, калі па меркаванні вышэйшага беларускага кіраўніцтва, вартая пахвалы ўнутраная палітыка Гітлера, а сталінскія рэпрэсіі трэба лічыць папросту памылкамі?

Уладзімір Лапцэвіч

## Лідэр Партыі БНФ у жывым эфіры „Радыё Палёнія"

5 чэрвеня на „Радыё Палёнія" ў жывым эфіры адбылася дыскусія аб развіцці беларуска-польскіх адносін у кантэксце ўвядзення ў хуткім часе візавага рэжыму паміж абедзвюма дзяржавамі. Апроч лідэра Партыі БНФ Вінцука Вячоркі ўдзел у дыскусіі ўзялі пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка, а таксама прадстаўнікі польскага Міністэрства замежных спраў і польскіх апазіцыйных партый.

У гэты ж дзень было агучанае рашэнне польскага боку адкласці тэрмін увядзення візаў для беларусаў. Вінцук Вячорка ацаніў гэты крок польскіх улад як імкненне падаць сігнал беларускаму грамадству, што нашую краіну чакаюць у Еўропе. Польскія ўдзельнікі дыскусіі, як з боку ўрада, так і апазіцыі пагадзіліся са старшынёй Партыі БНФ і ў чарговы раз прадэкларавалі, што Польшча бачыць Беларусь як еўрапейскую краіну.

Пасол Латушка ў сваю чаргу апраўдваў адмову беларускага боку ад „нулявога" варыянту тым, што бязвізавы рэжым мусіў быць толькі ўзаемным. Але, на думку лідэра Партыі БНФ, афіцыйны Мінск сам вінаваты ў тым, што краіны ЕС не бачаць сёння магчымасці ўвядзення ўзаемнага бязвізавага рэжыму з нашай дзяржавай, таму менавіта пазіцыя беларускага ўрада пярэчыць інтарэсам звычайных грамадзян Беларусі.

Вінцук Вячорка запярэчыў шэрагу выказванняў прадстаўнікоў польскага ўрада, што грунтаваліся на так званай дамове аб утварэнні саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, нагадаўшы рашэнне АБСЕ ад 1997 года аб тым, што „саюзная дамова" не ўгрунтаваная на дэмакратычнай волі беларускага народа.

*www.pbnf.org — афіцыйны сайт Партыі БНФ*

## Будзем вырошчваць агульны сад

Такое ўражанне, што напярэдадні ўводу візавага рэжыму Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь на Гродзеншчыне актывізаваліся кантакты паміж прадпрымальнікамі і бізнесоўцамі абедзвюх краін.

На мінулым тыдні ў Гродне адбылася сустрэча прадстаўнікоў грамадскага аб'яднання „Клуб прадпрымальнікаў" з прадпрымальнікамі Польшчы. Польскую дэлегацыю прадстаўлялі работнікі сельскай гаспадаркі і фермеры Падляшскага і Апольскага ваяводстваў. Усяго прыехала 29 гасцей. Асноўная мэта сустрэчы, па словах старшыні клуба прадпрымальнікаў Франца Мамуля, — азнаямляльная. Аднак на яе былі запрошаны кіраўнікі аблсельгаспроду і іншых дзяржаўных і недзяржаўных прадпрыемстваў Гродна. Госці наведалі адну з самых перадавых сельгаспадарак вобласці — „Прагрэс", якой некалькі гадоў таму кіраваў былы старшыня аблвыканкама Уладзімір Дубко. Ужо зараз, па словах Ф. Мамуля, дасягнуты некаторыя канкрэтныя дамоўленасці аб супрацоўніцтве. У прыватнасці, існуе праект аб стварэнні сумеснага прадпрыемства па пасадцы саду. Апольская дэлегацыя праявіла зацікаўленасць да супрацоўніцтва і паабяцала ў ліпені-жніўні афіцыйна запрасіць сваіх калег з Гродзеншчыны з адказным візітам.

Нагадаю, што падобная сустрэча гродзенцаў напачатку траўня адбылася з прадпрымальнікамі Любушскага ваяводства і горада Зялёна-Гура. Пасля яе было прынята рашэнне аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў у сферы абслугоўвання і дрэваперапрацоўкі.

Таксама на мінулым тыдні ў Гродне адбылася яшчэ адна рабочая сустрэча прадстаўнікоў гродзенскага абласнога ваеннага камісарыята і Ваяводскага ваеннага штаба Беластока. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні арганізацыі ўзаемадзеяння вайсковых адміністрацый у крызісных і надзвычайных сітуацыях. У межах сустрэчы беларускія вайсковыя спецыялісты распавядалі гасцям аб заканадаўчай базе, якая рэгламентуе дзейнасць вайсковых камісарыятаў краіны, структурах і задачах, якія вызначаюцца вайсковымі камісарыятамі. Польскія вайскоўцы таксама азнаёміліся з парадкам работы адміністрацыі абласнога зборнага пункта.

М. Мікалайчык
„Биржа информации",
№ 279 ад 12.06.2003 г.

## Дні беларускай эканомікі ў Познані

9 чэрвеня г.г. у рамках 75 Познаньскага міжнароднага кірмашу прамысловых і інвестыцыйных тэхналогій быў арганізаваны Дзень эканомікі Беларусі, а таксама прэзентацыя Нацыянальнай экспазіцыі Беларусі (працавала яна да 12 чэрвеня). Экспазіцыя прадстаўляла магчымасці развіцця эканамічных кантактаў паміж Польшчай і Беларуссю, галоўным чынам у галіне навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Арганізатарамі мерапрыемстваў выступілі Беларуская гандлёва-прамысловая палата, міністэрствы замежных спраў і прамысловасці Беларусі, Камітэт па навуцы і тэхналогіі пры Савеце Міністраў і Пасольства РБ у Польшчы. У познаньскім мерапрыемстве ўдзельнічалі беларускія банкі, вышэйшыя навучальныя ўстановы, Нацыянальная акадэмія навук і прадпрыемствы.

На канферэнцыі, якая выклікала значнае зацікаўленне польскіх прадпрымальнікаў, эканамічныя і інвестыцыйныя магчымасці двухбаковага супрацоўніцтва прадставілі пасол РБ Павел Латушка і прадстаўнік Міністра эканомікі Польшчы Альжбета Бадзіо ды прадстаўнікі прамысловых палат. Навуковая канферэнцыя была прысвечана магчымасцям фінансавання навукова-тэхнічных праграм, інавацыйных праектаў у Беларусі, функцыянаванню сеці інавацыйных і маркетынгавых цэнтраў вышэйшай школы ў Беларусі.

У рамках Дня эканомікі Беларусі адбыліся перагаворы паміж беларускімі і польскімі прадпрымальнікамі, а таксама былі заключаны дамовы аб супрацоўніцтве.

Паводле www.mfa.gow.by

## Візавы рэжым адтэрмінаваны

Візы на ўезд у Польшчу для грамадзян Беларусі, Расіі і Украіны будуць уведзены не 1 ліпеня г.г., але тры месяцы пазней — 1 кастрычніка. Такое рашэнне прыняў польскі ўрад, а краіны Еўрасаюза паставіліся да гэтага са зразуменнем. Прычына адтэрміноўкі — клопат пра польскіх грамадзян, выязджаючых у канікулярны перыяд на Усход, і просьбы ўсходніх суседзяў захаваць бязвізавы рэжым да канца летняга сезона, каб аблегчыць турыстычны рух.

Змену тэрміну ўвядзення візавага рэжыму прыхільна сустрэлі падляшскія прадпрымальнікі. Базары Беластока і іншых гарадоў штодзень наведваюць тысячы турыстаў з усходу, якія купляюць у нас вопратку, шырпатрэб, харчы, гародніну. Мяркуецца, што грамадзяне Беларусі, Расіі і Украіны на базарах Падляшскага ваяводства купляюць тавараў на 400-700 млн. долараў у год. Пасля ўвядзення віз прыток гасцей, прынамсі ў першых месяцах, зменшыцца на 40-50%, што адмоўна адаб'ецца на дзейнасці тых гандляроў і прадпрымальнікаў, якія абслугоўваюць кліентаў з-за ўсходняй мяжы. (вл)

## Падрыхтоўка да святкавання 140-годдзя паўстання Каліноўскага

У Свіслачы поўным ходам ідзе праца па падрыхтоўцы да святкавання 140-й гадавіны паўстання.

На месцы сядзібы братоў Каліноўскіх у вёсцы Якушоўка шкаляры свіслацкай школы пад кіраўніцтвам мясцовага кіраўніка „Таварыства імя братоў Каліноўскіх" Анатоля Валюка пачалі прыборку тэрыторыі. У мінулыя выхадныя прыборку на магіле Віктара Каліноўскага, брата кіраўніка паўстання, правялі актывісты таварыства.

На сярэдзіну чэрвеня ў Свіслачы запланаваны футбольны турнір, арганізатарам якога выступіла мясцовая футбольная каманда „Пагоня —Нараў".

А асноўныя мерапрыемствы па святкаванні гадавіны паўстання адбудуцца 25 кастрычніка, калі ў Свіслачы будзе арганізаваны вялікі фэст з запрашэннем гасцей з усёй Беларусі.

Андрэй Мялешка

# Вёска ў сённяшняй і будучай Еўропе

Нямецкая дэлегацыя рэгіёна Амт-Гатштэт, што ў ландзе Шлезвіг-Гольштэйн, якая з 22 па 25 мая пабывала на Гайнаўшчыне, прыняла ўдзел у сустрэчы „Вясковыя зоны сённяшняй і будучай Еўропы". Спатканне 24 мая ў гайнаўскім магістраце арганізавала Павятовае староства сумесна з Падляшскай сельскагаспадарчай палатай, Сельскагаспадарчым дарадчым комплексам у Гайнаўцы, Саюзам гаспадароў, гурткоў і сельскагаспадарчых арганізацый у Гайнаўцы і Агенцтвам рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы. Госці з Нямеччыны былі на Святой Гары Грабарцы, вадасховішчы Рэпчычы і ў галерэі Славаміра Смыка ў Кляшчэлях. Пабывалі на спаборніцтвах пажарнікаў у Дубічах-Царкоўных і запрасілі гайнаўскіх пажарнікаў у Нямеччыну.

У канферэнц-зале гайнаўскага магістрата з нямецкай дэлегацыяй спаткаліся гаспадары з Гайнаўскага павета. Каардынатар і кіраўнік Сельскагаспадарчага дарадчага комплексу ў Гайнаўцы Геранім Панятоўскі расказаў нямецкім земляробам пра ўмовы гаспадарання ў Гайнаўскім павеце і магчымасці развіцця сельскагаспадарчай прадукцыі. У Гайнаўскім павеце 75% палёў абсеяных збожжам, а на 10% ворнай зямлі вырошчваецца бульба. У сярэднім на 100 гектарах зямлі гадуецца 36 кароў. На Гайнаўшчыне пад 200 гаспадароў, якія гадуюць па 20 і больш кароў. Нямецкія гаспадары дзіву даваліся, што ў Польшчы вельмі малыя даплаты да сельгаспрадукцыі і вельмі нізкая сельскагаспадарчая пенсія. Ганс Фрыдрыхсен, старшыня лакальнага Саюза гаспадароў, расказаў пра сваю сельскагаспадарчую дзейнасць і яе вынікі. Гаспадарыць ён на 100 гектарах лугоў, 50 гектарах ворыва, гадуе 300 штук быдла і свіней. Прадае за год каля 600 тысяч літраў малака і збірае ў сярэднім па 5-8 тон збожжа з гектара. Хаця плацяць немцам па 90 еўра за тону пшаніцы і па 0,25 еўра за літр малака, то прыбыткі невялікія. Рэкампенсуюць іх даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі. У сярэднім нямецкім гаспадарам даплачваюць па 166 еўра да гектара сельскагаспадарчай зямлі. Дадатковыя даплаты даюцца да вытворчасці малака і жывёлагадоўлі. Нямецкі госць расказаў пра рост сельскагаспадарчай прадукцыі ў Нямеччыне. У 1970 г. у яго абшчыне з 437 тысяч гектараў зямлі сабралі 1 мільён 350 тысяч тон збожжа, а ў 2000 годзе з 323 тысяч гектараў зямлі атрымалі 2 мільёны 800 тысяч тон збожжа. Такі вялікі рост сельскагаспадарчай прадукцыі быў магчымы дзякуючы лепшай адукацыі гаспадароў і прымяненні новых тэхналогій вытворчасці.

— Толькі тыя сяляне, якія здолеюць справіцца з бюракратыяй, будуць маглі жыць з сельскай гаспадаркі, — заявіў Ганс Фрыдрыхсен. Хаця нямецкі госць не быў задаволены бюракратыяй, то станоўча ацаніў даплаты. Меў права быць задаволеным, бо ў сярэднім нямецкія гаспадары атрымліваюць па 100-200 еўра да адной штукі быдла, прыблізна па 20 еўра да авечкі і дадатковыя даплаты да малака. Да некаторай сельскагаспадарчай прадукцыі немцы атрымліваюць даплаты з самаўрадавых бюджэтаў, залежна ад іх фінансавага становішча.

— Найбольш нас зацікавілі цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю і даплаты, якія атрымліваюць нямецкія гаспадары, — сказаў Пётр Раманюк з Чаромхі.

— Нам цяжка гаспадарыць, бо слаба плацяць і цяжка прадаць сельскагаспадарчыя прадукты, — заявіў Ян Адамчук з Чыжоў, у якога 60 гектараў зямлі, а плён пшаніцы набліжаны да нямецкіх паказчыкаў (6-8 тон з гектара).

Пасля спаткання нямецкія госці наведалі вядучых гаспадароў Гайнаўскага павета: Ніканчукоў з Гарадзіска (гадуюць свіней), Садоўскіх з Храбустоўкі (гадуюць курэй), Грынявіцкіх з Трасцянкі (займаюцца гадоўляй гусей і быдла), Грынявіцкіх з Рагазоў (прадукцыя малака) і Галёнкаў з Пасечнікаў (гадоўля авечак і экалагічнае вырошчванне зёлак). Нямецкая дэлегацыя запрасіла гаспадароў з Гайнаўшчыны наведаць Нямеччыну.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Нямецкія госці ў гайнаўскім магістраце; другі злева — Ганс Фрыдрыхсен*

# Гайнаўскія інвестыцыі

У час апошняй сесіі Рады горада Гайнаўка радныя прынялі справаздачу па выкананні гарадскога бюджэту і адобрылі працу ўправы горада і бурмістра, які ад самаўрадавых выбараў самастойна кіруе самаўрадавымі структурамі. У 2002 годзе самай вялікай інвестыцыяй у Гайнаўцы было асфальтаванне 706 метраў вуліцы Аградовай, якое каштавала 145 тысяч злотых. Іншымі вялікімі інвестыцыямі былі будова асвятлення на вуліцы Белавежскай, мадэрнізацыя асвятлення на вуліцы Дварцовай і падрыхтоўка да мадэрнізацыі асвятлення ў цэлым горадзе (разам звыш 97 тыс. зл.). Асфальтаванне 432 метраў вуліцы Ланковай каштавала 96,5 тыс. зл. За 2002 год адрамантавалі 15 гарадскіх вуліц і падрыхтавалі дакументацыю для чарговых. У мінулым годзе вялася падрыхтоўка да будовы гарадскога амфітэатра, якая распачнецца ў гэтым годзе.

Радныя прынялі статут Комплексу школ н-р 2 у Гайнаўцы, які будзе дзейнічаць з інтэграцыйнымі аддзяленнямі. У час пасяджэння была прынята справаздача па выкананні гарадской праграмы прафілактыкі і вырашання алкагольных праблем у Гайнаўцы ў 2002 годзе. Сродкі на дзейнасць гэтай праграмы размерам 265 тысяч злотых былі ўзяты ад прадаўцоў алкаголю. (ам-з)

**Нараўчанская гміна**

# Новыя солтысы

У Нараўчанскай гміне выбралі 23 солтысы. У пятнаццаці салэцтвах не было змен. Новых солтысаў выбралі ў Лешуках (Уладзімір Рэент), Новым Ляўкове (Мікалай Лаўрашук), Старым Ляўкове (Марына Бандарук), Міхнаўцы (Ліля Пташынская), Міклашэве (Міраслава Трусевіч), Ахрымах (Андрэй Мядзведзь), Нараўцы (Юры Васільчык) і Заблоччыне (Анатоль Валкавыцкі).

Шмат гадоў выбіраюцца солтысамі Уладзімір Кічкалюк з Гарадзіска, Анатоль Раманчук з Гушчэвіны, Генрык Леўша з Янова, Уладзімір Хадакоўскі з Крыніцы, Юры Лукша з Альхоўкі, Ян Бірыцкі з Плянты, Віталь Сухадола з Падляўкова, Рыгор Трусевіч з Семяноўкі, Аляксандр Дрозд са Скупава і Станіслаў Садоўскі з Тарнопаля.

Солтысы, якім кончыўся тэрмін паўнамоцтваў і якіх сёлета не выбралі, атрымалі падзяку за працу і памяткавыя альбомы „Белавежская пушча — чатыры пары года".

Янка Целушэцкі

# Яны яшчэ здзівяцца

— Найбольшы наш абавязак — наладзіць свае адносіны з краінамі з-за ўсходняй мяжы, якія апіраліся б на цікаўнасць адных да адных і ўзаемную павагу, — сказаў у Беластоку міністр культуры РП Вальдэмар Дамброўскі.

Сустрэўся ён у Драмтэатры імя Аляксандра Вянгеркі з падляшскімі дзеячамі культуры ў рамках перадуваходнай выбарнай кампаніі некалькіх членаў урада. Акцёры тэатра прывіталі яго песнямі з пастановак. Міністр прызнаўся, што апошні раз быў у Беластоку ў палове сямідзесятых. Таму, мабыць, здзівіла яго, што палац Браніцкіх усё сядзіба вучэльні — Медыцынскай акадэміі, а павінен, як пераконваў, быць звязаны з „турыстычнай прамысловасцю".

— Трэба зразумець узаемазалежнасць паміж помнікамі старажытнасці і турызмам.

Падкрэсліў неабходнасць падрыхтоўкі менеджэраў культуры, якія спраўна ўмелі б хадайнічаць у справе еўрасаюзных грошай, якімі, галоўным чынам, распараджаюцца кіруючыя камітэты ў рэгіёнах.

Падкрэсліў таксама:

— Сэнс еўрапейскай інтэграцыі — у разуменні разнароднасці.

Дэпутат Яўген Чыквін звярнуў увагу на тое, што часта разнароднасць заўважаецца ў Беластоку як чужародны элемент, а нават варожы. Можна пачуць: „Гэта добра, што беларусы асімілююцца". Як жалюгодны прыклад пастаянных спораў, падаў манастырскі комплекс у Супраслі (апошнія сваркі за манастырскія катакомбы). З жалем успамінаў, што не запрашаецца ў Беласток Тэатр імя Я. Купалы з Мінска.

— Патрэбны імпульс звонку, таксама адукацыйны, каб бачыўся ў разнароднасці шанц, а не пагроза, — пераконваў дэпутат Чыквін.

Міністр Дамброўскі адказаў:

— Хто ведае, ці ў нашай частцы Еўропы беларусы — не найбольш спакутаваны народ. У адносінах да Беларусі ў нас абавязацельствы не толькі гістарычныя. Дапамога гэта адна з еўрапейскіх мер, так як і пашана для меншасці і адрознасці.

Прытым дадаў:

— Тое, што хтосьці беларус, не абазначае, што ён благі грамадзянін. Адрознасць гэта ўзбагачэнне, як кажа рымскі папа. Але, на жаль, „яны" таго, як і іншых слоў, не разумеюць. Такому нахабству інтэлігенцыя не можа паддацца.

І зажартаваў, спасылаючыся на шматкультурнасць і шматнацыянальнасць Польшчы:

— У Еўрасаюзе не ведаюць, каго прымаюць. Яшчэ яны здзівяцца.

Вальдэмар Дамброўскі заявіў, што ў наступным годзе зноў будзе 30 стыпендый таленавітай моладзі з Беларусі і Украіны:

— Справа ў тым, каб пабудаваць мост праз найбольш адкрытую думку і талент. Не можам казаць: талент беларускі, украінскі, польскі. Усе ў гэтай меры — патэнцыял свету.

На завяршэнне сустрэчы міністр культуры ад падляшскага маршалка Януша Кшыжэўскага і старшыні сейміка Збігнева Кшывіцкага атрымаў альбом Віктара Волкава і Анджэя Струмілы, а ад беластоцкага тэатра — плецены кошык з хатнімі вырабамі.

(холм)



*Жаўнеры Беларускай краёвай абароны*

# Нямецкая акупацыя Беларусі ў нямецкіх дакументах

Пра нямецкую акупацыю Беларусі напісалі ўжо хіба сотні кніжак і тысячы артыкулаў. Асабліва плённа літаратура на гэтую тэму ўзнікала ў савецкі перыяд, калі гісторыю II сусветнай вайны ствaралі паводле ўказанняў партыі. Таму калі пры канцы васьмідзесятых гадоў паказалася кніжка Юры Туронка *Беларусь пад нямецкай акупацыяй*, разбурыла яна ўсю будаваную доўгімі гадамі міфалогію. Цяпер беларускім гісторыкам з'явіліся добрыя ўмовы, каб пачаць рэканструкцыю падзей, што адбыліся ў Беларусі ў 1941-1944 гадах. У архівах даступнымі сталі матэрыялы, якія раней пэўна, маглі глядзець толькі давераныя чэкісты. Праўда, хаця можна ўжо гісторыкам знайсці крыніцы праўды, але дзяржаўны апарат усё яшчэ абмяжоўвае папулярызацыю ведаў, якія рашуча мінаюцца з савецкай гістарыяграфіяй.

Сярод матэрыялаў прысвечаных нямецкай акупацыі найбольшае ўражанне выклікаюць нямецкія дакументы (большасць іх пасля вайны была перакладзена на рускую мову), якія адлюстроўваюць стан ведаў немцаў пра акупаваную краіну. Акупанты пакуль прыйшлі ў Беларусь ведалі ўсё пра людзей, якія жылі на гэтай тэрыторыі. У 1941 г. немцы апрацавалі гісторыю Беларусі ад ранняга сярэднявечча па сучасныя ім дні больш дакладна, чым усе савецкія інстытуты на працягу дзесяткаў гадоў. Ведалі яны не толькі пра публічнае, але таксама прыватнае жыццё беларускіх дзеячаў, пражываючых у БССР, II Рэчы Паспалітай і ў эміграцыі. Не прапусцілі ніводнай важнай публікацыі напісанай беларускімі і іншымі аўтарамі пра беларусаў. Ведалі пра п'есы, якія ставіліся нават у правінцыйных тэатрах Савецкай Беларусі. Сачылі за рэакцыямі грамадства і ўлад пасля кожнай падзеі, нават культурнага характару. Апісалі антрапалагічныя тыпы жыхароў Беларусі ва ўсіх раёнах рэспублікі, змест фальклорных песень, сімволіку народнай абраднасці, побыт жыхароў — ад Панямоння да Палесся, матэрыяльныя ўмовы іх пражывання. Прадметам асаблівых аналізаў былі адносіны беларусаў з палякамі, рускімі, літоўцамі і ўкраінцамі. Немцы распараджаліся ведамі, якія дазвалялі ім кіраваць краінай пры заангажаванні невялікіх сродкаў і сімвалічнай колькасці нямецкіх паліцыйных і адміністрацыйных службаў.

Большасць беларускіх легальных устаноў, якія ўзнікалі падчас акупацыі ў ніякім выпадку не ствараліся немцамі дзеля пабудовы беларускай дзяржавы. Магчыма, што ў такі ход падзей верылі самі беларусы, але немцы не мелі ўвогуле такіх планаў. У асноўным Беларуская народная самапомач, а пасля Саюз беларускай моладзі служылі дзеля мабілізацыі беларускага грамадства да выезду на працу ў Нямеччыне. У 1941 і 1942 гг. немцы ў Рэйх бралі выключна добраахвотнікаў народжаных у 1920-1922 гадах. Да выезду ў Нямеччыну заахвочвалі высокімі платамі, добрымі сацыяльнымі ўмовамі жыцця, грашовымі і харчовымі кампенсацыямі для сем'яў, астаўшыхся ў Беларусі. Без ніякага прымусу толькі з Генеральнай акругі Беларусь выехала больш 13 тысяч дзяўчат і хлопцаў. Была аднак гэта колькасць невялікая ў параўнанні да тае, якой чакалі акупанты. Масавыя пацыфікацыі вёсак, праводжаныя немцамі ў 1943 г., мелі на мэце не толькі ліквідацыю партызанскага руху, але перш за ўсё былі паляваннем на нявольнікаў. Маладых і здаровых партызан гітлераўцы не расстрэльвалі, а часцей адсылалі як рабочую сілу ў Рэйх.

Жахлівасць пацыфікацыйных акцый выганяла аднак дзесяткі тысяч маладых людзей у партызанскія атрады. Таму летам 1943 г. пачалі арганізаваць маладзёжную структуру, якая канцэнтравалася б на выхаванні маладога пакалення ў перакананні, што ўсё што добрае для Нямеччыны, добрае таксама для Беларусі. Шэф Саюза беларускай моладзі Міхал Ганько атрымаў амаль неабмежаваны доступ да генеральнага камісара Вільгельма Кубэ і вялікія сродкі на арганізацыю лагераў для беларускіх юнакоў. Лагеры гэта нішто іншае, як выпалоскванне мазгоў паводле камсамольскіх прынцыпаў. Больш за 10 тысяч хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 20 гадоў, апранутых у нямецкія уніформы з беларускімі нацыянальнымі сімваламі, вырашыла працаваць для ўзмацнення вайсковага патэнцыялу Нямеччыны.

Чытаючы адозву да беларусаў, падпісаную кіраўнікамі Беларускай народнай самапомачы — Іванам Ермачэнкам, Вацлавам Іваноўскім, Вінцуком Гадлеўскім, Юліянам Саковічам, Уладзіславам Казлоўскім і мітрапалітам Філафеем, у якой яны апісваюць крыўды нанесеныя палякамі, маскалямі і жыдамі беларускаму народу і хваляць Гітлера за вызваленне еўрапейскіх народаў, чамусьці ўзнікае ўражанне, што тэксты пісаныя паводле такой логікі пастаянна прэзентаваліся нядаўна ў нашым дзяржаўным тэлебачанні з нагоды вайны ў Іраку. Акупацыю Ірака чамусьці і цяпер называюць вызваленнем іракцаў. Прапаганда, відаць, ніколі не зважае на рэальнасць, яна сама яе стварае паводле палітычных патрэб кіруючых кланаў.

Вобраз нямецкай акупацыі, які ўзнікае ад кантакту з дакументамі тае эпохі, рашуча іншы чым той прадстаўлены ў падручніках. Гэта ў аднолькавай ступені датычыць падручнікаў, якімі карыстаюцца маладыя палякі, а таксама беларусы і напэўна іншыя нацыі. Можа праз 50 гадоў пра акупацыю станецъ ужо гаварыць без эмоцый, а ўдзельнікі сучасных дыскусій перастануць прадаўжаць войны, якія закончыліся 60 гадоў таму.

Яўген Мірановіч

**Вачыма паляка**

# Паслярэферэндумная ўражлівасць

Стома рэферэндумнай кампаніяй і мне дакучыла. Парадаксальна, вастрэй чым заўсёды пачало да мяне даходзіць тое што наўкола, найбліжэй, на маім падворку — і то ў літаральным сэнсе. Верныя Чытачы гэтай рубрыкі пэўна памятаюць, што жыву я на адным з беластоцкіх блёкавішч. Штораз часцей бачу маладых людзей праседжваючых на лаўках пад пад'ездамі. З балкона бачу штодзень такую тусоўку маладзёнаў. Засядаюць зараз пасля 16. І там выседжваюць, як баба з аднае тэатральнае п'есы — да 22-23. Часам толькі пасля воклічу „Кангу-у-у!", з трэцяга паверха на пляцовачку непадалёк лаўкі падае футбольны мяч. Дадам, што той Кангу гэта малады чалавек, шчаслівы ўласнік таго круглага аб'екта мараў шмат якіх хлопцаў. Зараз пасля таго, як мяч прызямляецца на пляцоўцы, пачынаецца своеасаблівая забава: валяць мячом у сметніцу, што якраз пад маім балконам. Часам, калі гуляю ўвечары з сабакам і праходжу каля лаўкі, зачапаюць мяне: „Дай шлюга!" Гэта не просьба ані пытанне. Гэта патрабаванне, на фоне якога чуецца: „А як не, дык у морду дам!"

Пад вокнамі з другой часткі майго блёка ў апошні час іншыя юнакі шугаюць на роліках, мінаючы аўто на стаянках. Мала бяспечна, але, усё ж, гэта нейкая форма спорту, толькі што з глыбокім удыхваннем смуроду. Ды гэта не мая праблема. Мая пачынаецца тады, калі спартсмены з гучным вывіхам саскокваюць з парога тратуара на вулічны асфальт. Калі аднойчы ў пасляабедні час папрасіў я аднаго скакуна пранесціся з-пад маіх вакон на асфальт непадалёк блізкіх лугоў, пачуў:

— А што, ужо „начная ціша"?!

Фактычна, чаго я хачу? Гэта мая празмерная ўражлівасць, сам жа ж сказаў — ад рэферэндумнай стомы. У адну гарачую суботнюю ноч зачыніў я вокны, каб не чуць гакання мячя ў сметніцу і грукату ролікаў. Пацеў я, вырачыўшыся ў тэлевізар. Па беластоцкім тэлебачанні паказвалі якраз дваццаціхвілінны рэпартаж з уручання ўзнагарод крутым прадпрымальнікам — амбасадарам бізнесу. Файна, падумаў я, хтосьці ў нашым рэгіёне штосьці робіць, каб нам усім лепш было. У матэрыяле, аднак, замест дасягненняў нашых бізнесоўцаў, што і руш паказвалі багата застаўленыя сталы і самаўрадавую ды ўрадавую мясцовую знаць, якая выдатна гуляла. Я моцна знерваваўся гэтым банкетаваннем улады, якое ўдарала па мне бы падворкавы мяч і ролікі. Пераключыў канал. На іншай тэлестанцыі пачуў, што камісар па справах уваходу Польшчы ў ЕС Гюнтэр Ферхойген ацаніў нашы падрыхтоўкі да ўваходу ў еўрасаюзныя структуры на тры з плюсам. Не, толькі не Еўрасаюз, падумаў я і зноў змяніў канал. Там нейкая панна размаўляла з прэм'ерам Лешкам Мілерам, які тлумачыў, як разумець выказванне камісара, якое я якраз пачуў. — Два з плюсам гэта найменш чатыры з плюсам, бо пан Ферхойген ужывае сістэму ацэнкі паспяховасці свае краіны, значыць, больш чым адзінка. Здурнеў я. Тры з плюсам, два з плюсам, адзінка з плюсам?

Тэлевізійная спроба ўцёкаў ад стомы таксама не ўдалася. Зачыніў я тое сваё „акно ў свет". Пайшоў з сабакам на той недалёкі луг, які прапанаваў ездакам на роліках. Чым далей углыб, рабілася ўсё цішэй, супакойліва. Буду, здаецца, хадзіць туды ўсё часцей.

* * *

Пасля некалькіх дзён шпацыроў, дакладна ў дзень майго нараджэння, атрымалася так, што палякі рашыліся на ўваход у Еўрасаюз. Цяжка было б здзіўляцца, што на Падляшшы прысутнасць на рэферэндуме і падтрымка ЕС былі на некалькі працэнтаў меншыя чым у рэшце краіны, а ва ўсёй Польшчы — не імпануюча вялікія. З маіх назіранняў вынікала, што калі б у рэферэндумную нядзелю выбарчыя ўчасткі былі адкрытыя даўжэй чым да 20 гадзіны, паспелі б прагаласаваць тыя, хто вяртаўся ў той дзень са спякотнага уік-энду. Я згодны і з Лехам Валэнсам, які сухой ніткі не пакінуў на палітыках, радасна вяшчаючых перад галасаваннем, што калі прысутнасць будзе меншая чым 50%, то і так вырашыць Сейм. Мая больш за сямідзесяцігадовая хворая суседка якраз таму не пайшла на выбарчы ўчастак, хоць чэпала ў апошнія гады, нягледзячы на нямогласць, на ўсе.

З майго балкона бачыў я аднак, што на выбарчы ўчастак ішлі ў суботу і нядзелю іншыя пажылыя людзі, моладзь — зрэдчас. Але і такі па ўзросце мой мікраараён. Я быў упэўнены, што вялікі адсотак галасоў будзе на „не". Аднак жа ж — не хопіць, што галасавала аж тры чвэрці нашых жыхароў (калі параўноўваць з апошнімі выбарамі — на адну чвэрць больш), то яшчэ большасць выказалася „так" (614, супраць — 208). Пэўна, большасць спелых людзей меркавала: „Можа, нашым дзецям і ўнукам будзе лепш".

Заўважыў я, што і заходні свет глядзеў на наш рэферэндум, але не ацэньваў гэту падзею ў палітычных катэгорыях, як часта мы самі. Амерыканская тэлестанцыя CNN, як і брытанская BBC World спалучылі рэферэндум у Польшчы ў сваіх сервісах з эканамічнымі навінамі. Пэўна, мелі рацыю, бо лёсы еўрапейскай супольнасці 25 краін будуць вырашаць перш за ўсё гаспадарка і эканоміка, да высокага ўзроўню трэба будзе падцягнуцца.

Ад заўтра буду хадзіць па маім лузе — ужо, без сумнення, еўрасаюзным. Шкада толькі, што сам факт таго, што несумненна ад 13 чэрвеня будучага года станем членамі саюзнай супольнасці, апертай на ўзаемнай павазе, талерантнасці і гэтаму падобных каштоўнасцях, ніяк не паўплывае, прынамсі пакуль што, на маіх суседзяў на роліках, сметнікавых футбалістаў і некалькіх „герояў" гэтай рубрыкі, галоўным чынам з LPR. Ну, што зробіш. Яны таксама будуць ва *Уніі*. Але, на шчасце — веру ў гэта — ад паловы чэрвеня 2004 г. страціць сэнс пагаворка „адзін у полі — не воін".

Мацей Халадоўскі

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

# У дарослы свет

З Гайнаўскага беларускага ліцэя 4 чэрвеня выйшла ў шырокі, дарослы свет наступнае пакаленне выпускнікоў. Звычайна пры такой нагодзе адбываецца велізарная ўсяшкольная ўрачыстасць, з запрошанымі гасцямі, прадстаўнікамі мясцовых улад (сёлета са старастам Уладзімірам Пятрочукам) і бацькамі выпускнікоў (на чале са старшынёй бацькоўскага камітэта Марыяй Ляшчынскай). Трэцякласнікі рыхтуюць артыстычныя выступленні. І ў гэтым годзе не было інакш. Абітурыенты традыцыйна пачулі апошні школьны званок, уручылі кветкі настаўнікам і астатнім працаўнікам школы, падзякавалі тым, з кім прыйшлося ім правесці чатыры гады школьнага жыцця.

Не дзіўна, што стварылася ўзнёслая атмасфера. Стала яна яшчэ больш узнёслай, калі дырэктар Яўген Сачко зачытаў прамову. Звярнуў у ёй увагу на тое, што абітурыенты не выходзяць з абы-якой школы, а менавіта з беларускай і што іх чатырохгадовая тут адукацыя павінна пасадзейнічаць таму, каб у далейшым развівалі яны родную культуру і ўзбагачалі ёю ўсю краіну. Пра неабходнасць захавання традыцыі выказваліся і іншыя госці — беларускія дыпламаты: Наталля Латушка — жонка пасла РБ, Мікалай Пятровіч — саветнік пасольства РБ з Варшавы і Аляксандр Карачун — консул РБ з Беластока, а таксама Яўген Вапа з беластоцкага Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь. Усё-такі выступленне Яўгена Вапы заключала ў сабе не толькі універсальныя мудрасці, але таксама больш інтымныя прызнанні, як хаця б успаміны з часу, калі ён сам вучыўся, а затым працаваў настаўнікам у ліцэі.

У падобным, свабодным тоне прамовіла і спадарыня Наталля Латушка. Дацаніла яна тое, што многа маладых людзей вывучае на Беласточчыне беларускую мову, павіншавала ўсіх абітурыентаў з заканчэннем школы і пажадала ім радасных канікул. На канец засяродзілася на спецыяльнай узнагародзе, якую Пасольства Беларусі ў Варшаве вырашыла штогод прызначаць аднаму вучню нашага ліцэя, які найбольш актыўна дзейнічае на ніве беларускай культуры. Сёлета гэтае вылучэнне атрымала Аліцыя Леанюк. Калі справа ў іншых узнагародах, дык як заўжды падаркі ад школы і ад сяброўак з калектыву атрымалі пакідаючыя ліцэй дзяўчаты са „Знічкі", а таксама найлепшыя футбалісты, баскетбалісты і бегуны.

Самымі важнымі, аднак, з'яўляюцца ўзнагароды за добрыя вынікі ў навуцы. У гэтым годзе восем асоб атрымала пасведчанні з чырвонай палоскай, а дваццаць чатыры напісалі экзамены на атэстат сталасці з сярэдняй ацэнкай вышэйшай за пяцёрку. Найлепшы вынік (адны шасцёркі) атрымала Магдаліна Стангрыцюк — віншуем!

Як штогод, ліцэісты атрымліваюць шматлікія стыпендыі: адну, прыватную ад трох гадоў прызнае Марк Сабалеўскі, дзве — Царкоўны фонд „Годнае жыццё". Ад наступнага школьнага года мае ажыццявіцца ідэя пяці стыпендый Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь. Дзве з іх маюць атрымаць ліцэісты, а тры — выпускнікі ў якасці дапамогі на першы год навукі ў ВНУ. Гэта называецца „стыпендыяй памоставай" з-за таго, што яна дазваляе бесклапотна прайсці дарогу між сярэдняй і вышэйшай школамі.

Заканчэнне сярэдняй школы справа сур'ёзная, але гэта не абазначае, што на ўрачыстасці не здарылася нічога смешнага і вясёлага. Здаецца, найзабаўнейшы момант быў у час выступлення „Знічкі", якая штогод уводзіць у свой рэпертуар новыя песні, але мае таксама свайго роду „класіку", якую чулі шмат разоў усе вучні. Вось калі тым разам дзяўчаты пачалі спяваць добравядомую песню „Рэкрут", усе абітурыенты ўсталі, пляскалі ў далоні, танцавалі, а нават дапамагалі „Знічцы" выконваць прыпеў. Ці нельга аб'явіць „Рэкрута" гімнам нашай школы?

Чацвёртых класаў ужо няма, трэцякласнікі сталі раптам найстарэйшымі вучнямі ў школе. Праз год і нас чакаюць экзамены на атэстат сталасці, і развітанне з ліцэем. Маю надзею, што гэты год усё-такі не міне надта хутка.

Зося Лемеш

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

**У сэрцы Беларусі**

# Траецкае прадмесце

Вось месца, дзе калісьці існаваў старажытны Мінск. На другім беразе ракі знаходзіцца маляўнічае Траецкае прадмесце. Назва яго паходзіць ад храма Святой Тройцы, які тут калісьці існаваў. Сёння захавалася некалькі будынкаў Узнясенскага манастыра, дзе знаходзіцца шпіталь.

Вяртаемся да самога прадмесця. У 80-я гады яно было рэканструявана і рэстаўравана. Гэта адзін з прыгажэйшых куткоў Мінска. Шкада толькі, што з аднаго боку праходзіць рухлівая вуліца Багдановіча, якая адзін бок гэтага гістарычнага комплексу робіць немагчымым для адпачынку. Але і тут варта пашпацыраваць і зайсці хаця б у „Ломбардъ".

З іншага боку прадмесця рака Свіслач. Тут сапраўднае месца для тых, хто хоча адпачыць. Насупраць месца, дзе было замчышча, у Траецкім ёсць букіністычны магазін, ёсць таксама і крама з беларускімі сувенірамі, даведнікамі па Беларусі (такія ўжо пачалі паяўляцца!). Тут, чуў я, адна прадаўшчыца размаўляла па-беларуску. І добра. У гэтым магазіне (за рэкламу служаць — саламяны вялікі конь і саламяная кабета) можна набыць свечнікі, якія маюць форму помнікаў беларускага (і не толькі) дойлідства, напрыклад, царква ў Мураванцы, ці вежа ў Нясвіжы. Усярэдзіну ў такі будыначак устаўляецца свечы. Варта наведаць гэты магазін.

У Траецкім ёсць некалькі месц, дзе можна і смачна з'есці, напрыклад, „Карчма Старавіленская" ці рэстаран „Траецкі". Ёсць і музеі — прыроды, Максіма Багдановіча, гісторыі беларускай літаратуры. Каля прадмесця ёсць Востраў слёз. Гэта мемарыяльны комплекс з капліцай, у гонар жаўнерам, загінуўшым у Афганістане. Канешне, вайна гэтая (як і ўсе іншыя) была непатрэбнай, але помнік гэты так. Чаму? Таму, што на гэтую вайну пасылалі вельмі маладых хлопцаў, забіралі, каб тыя змагаліся невядома за што. Гэта можна нават падцягнуць пад генацыд. Хлопцы гэтыя — сыны Беларусі. Вось чаму гэты помнік павінен існаваць.



*Мемарыяльная капліца на Востраве слёз.*

У каплічцы выпісаны імёны тых, што загінулі. Вакол яе стаяць плачучыя маці. На востраве знаходзіцца плачучы анёл і сімвалічны алтар у колеры хакі. Прыгожа выглядае мост, вядучы на гэты востраў. Уначы ён падсвятляецца на чырвоны колер.

Вось, так больш-менш выглядае гэты куток Мінска. Вуліца Багдановіча ідзе ў напрамку месца, дзе радзіўся славуты мастак слова. На жаль, дом, дзе ён нарадзіўся, не існуе. Ёсць яшчэ Траецкая гара. На ёй сёння парк і агромны Тэатр оперы і балета. Раней на гэтым месцы (да 1930-х гадоў) быў рынак. Перад тэатрам стаіць помнік Максіму Багдановічу. Вецер развейвае яго валасы, глядзіць ён на Мінск, горад яго ранняга дзяцінства, на сэрца Беларусі...

Аляксей Дзядак

# Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Выступаюць Залукі*

# Тэатр — гульня і навука

Узнагароду Гран-пры сёлетняга Тэатральнага беларускага агляду атрымаў „Антракт" з Бельска-Падляшскага. Калектыў пад кіраўніцтвам Альжбеты Фіёнік выступіў са спектаклем „Казка пра бельскага цмока".

— Наша п'еса аўтарская, на аснове агульнавядомых казак, — кажа Альжбета Фіёнік. — Мы тут стварылі ўласную легенду, бельскую.

Калектыў працуе ў Бельскім доме культуры. Акцёры — у большасці навучэнцы бельскай „тройкі".

Агляд тэатральных форм для пачатковых школ і гімназій, ужо чарговы год, наладзіла Беларускае грамадска-культурнае таварыства. На сцэне Гайнаўскага дома культуры выступіла 15 калектываў: з Гайнаўкі, Нарвы, Беластока, Гарадка, Залук, Кляшчэляў, Рыбалаў, Бельска-Падляшскага, Орлі, Дубіч-Царкоўных, Беластока. Агляд праходзіў 29 мая г.г.

Цікавы спектакль паказалі навучэнцы з Залук. Тым больш, што ў школе адсутнічае навучанне беларускай мовы.

— Мы падрыхтавалі сцэнку пад ёлку, — кажа Яўгенія Грушэўская, настаўніца з Залук.

Дзеці з Залук паслужыліся таксама агульнавядомым сюжэтам. Героі родам з польскага культавага фільма „Самі свае", (пераназваныя для патрэб спектакля: Ванька — Паўляк, Максім — Каргуль, Гандзя — Аня) гутарылі пра экалогію, карацей — пра шкоду ад забруджвання прыроды.

Цудоўна іграли акцёры: Агнешка Паплаўская (Ванька), Дарак Даўэш (Максім), Сільвія Літвін (Гандзя), Іаанна Паплаўская (Маня).

П'есу падрыхтавалі настаўніцы: Яўгенія Грушэўская і Ева Паплаўская.

— Ад верасня, разам з пачаткам новага навучальнага года, мы адновім навучанне роднай мове, — кажуць настаўніцы. Беларуская мова вернецца пасля 5-гадовага перапынку. На ўрокі запісалася палова навучэнцаў. Менавіта таму і быў створаны спектакль.

Гульня ў тэатр гэта форма, якая ўзбуджае цікавасць для роднай мовы.

ЗОРКА

PS. Артыкулы пра іншыя тэатральныя калектывы і спектаклі надрукуем у наступных нумарах „Зоркі".

# Польска-беларуская крыжаванка № 25

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку н-р 21**: Шапка, нагода, воўк, галоўка, Ас, зара, жаба, бар. Сава, голуб, шоўк, адказ, шпак, Аб, мара, камісар.

Узнагароды — **запісныя кніжкі** — выйгралі: **Эвеліна Лемеш** з Орлі, **Сільвія Лісавец** і **Іаанна Казёл** з Гарадка, **Анна Хількевіч** з Бельска-Падляшскага, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Кася Сянкевіч** з Нарвы, **Сільвія Герасімюк**, **Ева Янцэвіч** і **Паўліна Мароз** з Новага Корніна. Віншуем!




## Нашы птушкі і раслінкі

Неўзабаве канікулы. Многія з нас паедуць адпачываць у горы, на мора ці азёры, рэчку, у лес або ў вёску да бабулі.

У вольны час прапануем вам назіраць прыроду. Яе тайны заварожаць вас!

Зараз прапануем цыкл вершаў пра птушак і раслін аўтарства Ніны Мацяш. На пачатак — верш пра начную аўдотку, птушку якую звычайна прымаем за саву.

А, можа нехта з вас, дарагія дзеці, намалюе аўдотку?

ЗОРКА

*Ніна Мацяш*

### *Аўдотка*

*„Цюрлі, цюрлі, цюрлі", —*
*нясецца ўшыр ад зямлі.*

*Хто гэта, голас чый*
*журбуе так уначы?*

*Хто будзіць лугі, палі*
*самотным „цюрлі, цюрлі"?*

*Ды гэта ж птушка аўдотка!*
*Жаліцца нам, сіротка,*
*што знікла яе радня,*
*цюрлікаціме да дня...*

### *Дождж*

*Ідзе дождж — ідзе*
*Залатыя кроплі свае нясе —*
*над людзьмі.*
*Залатая кропля падае, падае.*
*Падае дождж — падае, падае.*
*З неба ідзе залаты дождж.*

*Аня Арцямюк (Парцава),*
*VI кл. ПШ у Аўгустове*

## Пра крыж у вёсцы Кнаразы

На пачатку вёскі знаходзіцца высокі драўляны крыж. Яго паставілі пасля першай вайны на свята Панцеляймона. Тады панавала эпідэмія халеры. Вельмі многа людзей памерла. Некаторыя жыхары вёскі параіліся, каб ушанаваць іх памяць і адслужыць у дзень св. Панцеляймона службу. Сказалі, каб у той дзень усе засталіся ў вёсцы. Аднак адзін чалавек не паслухаў прыказу і выехаў у Бельск. Калі вярнуўся ў Кнаразы, лёг адпачыць і ўжо не прабудзіўся.

Цяпер, калі людзі праходзяць каля таго крыжа, заўсёды моляцца.

Запісала Аня Андраюк,
VI „б" кл. бельскай „тройкі"

# Агатка і звярынец

Агатцы выезд у горад — атракцыён. Не на адзін дзень, а на тры тыдні. Асабліва да цёці Яны і дзядзькі Толіка. Вялікіх арыгіналаў. Цёця — пісьменніца, дзядзька — мастак-сатырык. Дзяцей у іх сваіх няма. Затое поўны падворак звяроў. Бо хоць жывуць яны амаль у цэнтры горада, ды на ціхай вуліцы з невысокай драўлянай забудовай, у цяні старых дрэў. Ну, быццам у вёсцы. Дом у іх драўляны, з падстрэшкам, хоць з усімі выгодамі. І садок паросты акуратнай муравай, і грэцкія арэхі там растуць, па якія прыбягае вавёрка ды сварыцца за іх з дзядзькам Толікам. У садку — невялікі абмураваны басейн з рознымі ўзроўнямі вады. Прыемна! Файны адпачынак! Шкада толькі, што прыйдзецца больш часу самой праводзіць, і займацца звярынцам. Аб гэтым сказала Агатцы цёця Яна — яна едзе на выстаўку ў горы, а дзядзька, як, вядома, сатырык, часам забываецца, на якім свеце жыве. А дома — гаспадарка!

— Вось — Мышка, — прадставіла была Яна Агатцы вялікую шэрую сучку. Мышку ўзялі ў прытулку для звяроў яшчэ маленькім шэрым шарыкам, і вось якая „мышка" вырасла!

— А гэта — Буба, — паказаў дзядзька на тоўстую рудую таксіху. — Яна тут пані Буба, кіраўнічка ўсяго што жывое. Трэба з ёю лічыцца.

— А гэта — Бегемот, — прадставіла цёця вялікага чорнага ката. — Ён важыць дзесяць кілаграмаў і патрабуе пашаны.

Бегемот, сапучы ад натугі, ускараскаўся Агатцы на калені. Сапраўды, быццам дзесяць торбаў з цукрам узваліліся. Відаць, есці любіць!

А яшчэ і рыбкі, і два папугайчыкі!

Пільнаваць іх і не трэба — кожны мае занятак. Бегемот ходзіць кудысьці па сваіх справах, сабакі ганяюцца па садку. Дзядзька Толік малюе розныя смешныя малюнкі, смяецца з іх сам, рагоча пад арэхам. Увечары зводзіць Агатку ў кіно, пасля сам кудысьці прападае. Нудна! Нават тая вавёрка не такая цікавая.

Аднойчы пад раніцу сабакі і кот звар'яцелі. Ганяліся па падворку з лямантам. Дзядзька Толік выйшаў на парог.

— Агатка, глядзі, фазана ловяць!

Агатка працерла заспаныя вочы. За птахам бегалі Мышка, Буба і Бегемот. Загналі яго пад дошкі, нарыхтаваныя для пабудовы шопкі.

— Дзядзька Толік, ды ж гэта не фазан, а анёл! — крыкнула Агатка. — Ратуйце яго.

— Вось табе наснілася! — дзядзька залез пад дошкі, схапіў фазана за крылы і вывалак, беднага, з-пад зубоў натхнёных паляваннем жывёл. — Вынесу яго на бераг рэчкі Белай, выпушчу, хай ляціць да сваіх.

— Хай ляціць да анёлаў! — не здзівілася Агатка.

Міра Лукша

Тэатральны калектыў з Нарвы з настаўніцай Нінай Абрамюк

# Дзень маці ў Арэшкаве

26 мая г.г. у Арэшкаве ўрачыста адсвяткавалі Дзень маці. У школу прыйшлі мамы навучэнцаў ды гэты дзень запамятаўся радасным і ўрачыстым.

Раней вучні ўласнаручна падрыхтавалі запрашэнні, а таксама багатую мастацкую частку. На занятках пластыкі яны выканалі папяровыя кошыкі з кветкамі, віншавальныя карткі, падушкі на іголкі...

Старэйшыя школьнікі ўпрыгожылі залу, над якой красаваўся лозунг: „Табе мама — з усяго года — усяго па-троху".

Яшчэ да гэтага падрыхтавалі салодкі стол.

Усё пачалося апоўдні — дырэктар Гражына Бэрэзняк прывітала гасцей. Далейшую частку праграмы павялі вучні. На пачатку выступілі Юлія Міхалоўская, Матэвуш Бугвін і Павел Чурак, якія чыталі свае вершы, шчырыя творы — напісаныя спецыяльна мамам.

Выступілі таксама вучні 0-І класаў, якіх падрыхтавала настаўніца Бэата Маркевіч. Затым навучэнцы IV-VI класаў заспявалі чароўныя беларускія песні, як, напрыклад, „Мамачка".

Цікава паказаліся вучні II і III класаў, якіх падрыхтавала Лідзія Панькоўская. Эля Антанюк прадставіла гістарычны нарыс пра Дзень мамы, была тэатральная сцэнка і песні.

На канец усе селі за салодкі стол. Матулі любаваліся сваімі дзеткамі, а яны таксама — бо іх урачыстасць спадабалася дарагім мамам.

Міхал Мінцэвіч

# Юлітка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Юліта Нікалаюк з Беластока вельмі хвалявалася перад выступленнем у конкурсе „Роднае слова". Дзяўчынка хадзіла па калідоры, кагосьці выглядала...

Дэкламавала верш Авяр'яна Дзеружынскага — „Я ляпіла чарапаху". Пасля, разам са сваімі сябрамі з ПШ н-р 4, паехала на цэнтральны агляд у Нараўку.

І хаця не заваявала яна Гран-пры (аб чым мараць усе дэкламатары!) Юліта была задаволена.

У час, калі яна выступала на сцэне, у залу зайшоў яе тата. Ён прынёс добрую навіну. У Юліты нарадзіўся брацік.

— Будзе называцца Тэодар, — кажа шчаслівая першакласніца.

Зорка

# Спорт на канікулы

У сучасным свеце спорт займае важнае месца. Ён увайшоў у жыццё амаль кожнага чалавека. Многа людзей займаецца ім сістэматычна для свайго здароўя — яны проста любяць фізкультуру. Розныя бываюць віды спорту. Можна бегаць на кароткія ці доўгія дыстанцыі, гуляць у валейбол, баскетбол, тэніс, футбол або займацца плаваннем.

Я асабліва люблю ездзіць на ровары. Па-мойму, кожны рух умацоўвае здароўе, наша сэрца, увесь арганізм. Я сядаю на ровар нават пасля цяжкай разумовай працы. Разам з маёй сяброўкай Юстынай, якая жыве недалёка ад мяне, часта ездзім у цэнтр горада з'есці смачнае марожанае, або наведаць іншую сяброўку. Проста хочацца паездзіць і паглядзець на людзей. Летам, калі ў нас многа свабоднага часу, мы едзем на далейшыя экскурсіі, напрыклад, на вадасховішча Бахматы ў Дубічах-Царкоўных, або да маёй бабулі на вёску. Я гэтым спортам займаюся ўжо даўно, але апрача язды на ровары, я вельмі люблю хадзіць на шпацыр з маім сабакам Пафікам.

Я думаю, што спортам, хаця трошкі, павінны займацца ўсе, таму што нават кароткі шпацыр можа падмацаваць арганізм. І чым больш руху на свежым паветры, тым менш хвароб. Я ўсім рэкамендую на канікулы актыўны адпачынак у крузе цэлай сям'і. Гэта падмацуе вашу фізічную і сямейную сілы.

Марта, III „а" кл.
Гімназіі з днбм ў Гайнаўцы

# Трэці крыж

У вёсцы Дыдулі, назва якой ад слова „Деды", знаходзіцца мураваны крыж. Гэта ўжо трэці крыж, які стаіць у тым самым месцы. Першы быў пастаўлены 300 гадоў назад. Як усё старэецца, так і гэты крыж абваліўся ад старасці. Падобны лёс спаткаў другі крыж. У 1975 годзе на гэтым месцы зноў быў пастаўлены крыж, які стаіць па сённяшні дзень. На ім напісаны словы:

Спаси Господи
Люди твои
и благослови
достояние Твое.

У час паховінаў людзі пры гэтым крыжы моляцца за памерлага. Крыжам апякуюцца людзі з вёскі, між іншым пані Грыгарук, з якой я правёў размову на гэтую тэму.

Рафал Сельвясюк,
III „б" кл. Гімназіі ў Орлі

# Папраўка

У „Зорцы" № 24 ад 16 чэрвеня г.г. у артыкуле „Хрысціны ў Цэнтры" мы памылкова назвалі прозвішча дырэктар польска-беларускага садка № 14 у Беластоку. Завецца яна **Люцыя Німяровіч**. Дырэктар і чытачоў просім прабачэння.

Зорка

# Мая Орля

Орля распаложана ў 12 кіламетрах ад Бельска-Падляшскага.

Я — радавітая арлянка. З гэтай мясцовасцю звязаны маё дзяцінства і першыя гады навукі ў школе. З сантыментам успамінаю сваіх сяброўак і маю першую настаўніцу — Валянціну Хіліманюк. У школе мне вучылася вельмі добра. Там панавала сямейная атмасфера. Беларускую мову я пачала вывучаць з другога класа. Ужо два гады я вучуся ў ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім. У новым класе адчуваю сябе добра, у мяне новыя сяброўкі. Аднак часта ўспамінаю Орлю.

Дарота Праховіч, VI „а" кл.
ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Божая Маці Ласкавая ў зембінскім касцёле*

Распазнаў яе праз некалькі дзён. Ішла пляжам, ён прытаіўся ў акне.

— Пабачыў яе дзіцяча-жаночае цела, той знаёмы крок, тыя жэсты. Так! Яна — дзяўчынка з казкі — Галюшка з белай краіны дзяцінства.

Сальвадор Далі закахаўся насмерць.

Праз колькі дзён зноў ішлі моўчкі пляжам.

— Я хацеў дакрануцца яе рукі, абняць яе, — чытаем у „Маім сакрэтным жыцці", — а яна першая ўзяла маю руку і сказала: „Мой маленькі, заўсёды будзем разам".

* * *

У Зембіне, калі пытаем пра Галю Элюар, чуем адзін адказ:

— Здзесь такой нету!

На лавачцы, ля царквы св. Міхаіла, дзве прыгажуні. Янка і Віка.

— Адна нуда, — кажуць пра жыццё ў Зембіне.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Яна Грыгор'ева і Вікторыя Чэрвінская ў Зембіне*

# Галя — цудоўнае шчасце Сальвадора Далі

Ужо ў дзіцячыя гады Сальвадор Далі кахаў сваю Галю. „Бачыў" яе малой дзяўчынкай у санях, якія несла па белай краіне руская тройка. Галюшка з жывымі вачыма, ноздрамі як у звярка, ахутаная ў белую футру, уцякала... Ззаду даганяла яе гайня ваўкоў з палаючымі ад голаду слепакамі.

— Пагоня! — жартуем.

Іншы раз ён „бачыў" сваю Галюшку ў белым горадзе, з бліскаўкамі купалаў цэркваў. Дзяўчынка махала да яго рукой, давала знак.

У 1929 годзе Сальвадор Далі сустрэў яе ў рэальным жыцці — Галю Дзялувіну-Дзяконаву, з мястэчка Зембін што непадалёк Барысава, Мінскай вобласці.

* * *

У Зембіне, у вышчэрбленай арачнай нішы барочнага касцёла, скульптура Божай Маці. Над галавой Мадонны буслы звілі гняздо. У сярэдзіну будынка лепш не заходзіць — згары, як град, сыплецца друз. На сценах сляды ад куль і бомбаў. Ззаду запушчаны стары могільнік. Між кустоў бэзу — старыя жалезныя помнікі.

*Галя і Сальвадор, 1929 г.*

Дом культуры таксама ў духу карцін сюррэалізму. З аднаго боку абвальваецца сцяна.

— „Камуністычны вампір"! — прыдумваем будыніне-карціне загаловак.

Ва ўстанове, хаця ранняя паабедняя пара, вісіць замок на дзвярах.

Зембін вядомы з XVI стагоддзя. Мястэчка належала Кішкам, потым Саковічам, Храптовічам. Зараз тут цэнтр сельсавета і калгаса. У вёсцы пражывае да тысячы жыхароў. Калі распытваем пра атракцыёны, мясцовыя кіруюць нас да Брацкай магілы савецкіх воінаў і партызан.

* * *

Францыя, 1929 год. Пляж у Кадакесе. У госці да Сальвадора Далі з'язджаюцца сябры сюррэалісты. Між іншым паэт Поль Элюар з жонкай Галяй. Пра іх сужонства ходзяць легенды. Галя вядзе раман з Максам Эрнстам, пачынальнікам дадаізму, затым і сюррэалізму. Пасля, калі будзе вянчацца з Сальвадорам Далі, іх старшым сватам стане яе былы муж, Поль Элюар.

— З твару Галя паказалася мне вельмі інтэлігентнай, — успамінае першую іх сустрэчу Далі, — аднак, выглядала на тое, што яна стомленая і незадаволена гасцінай у Кадакесе.

Вечарам — першы іх шпацыр. Галя прызнаецца, што на хаду фальшыва ацаніла мастака. Здзіўлецца лагічнасцю яго роздумаў.

У той час Далі паводзіць сябе як вар'ят. Смяецца без толку і патрэбы, у час атакі смеху качаецца па зямлі...

Дзяўчаты прыехалі на канікулы, праветрыцца ад гарадской нуды. Цяпер не могуць дачакацца канца канікул. Пра жонку Сальвадора Далі тут не чулі.

— Сапраўды, яна родам з Зембіна? — ажыўляюцца на момант.

У магазіне таксама „не чулі і не бачылі".

— Ахвяруйце, калі ласка, на нашу царкву, — кажа прадаўшчыца. У Зембіне ідзе рамонт мураванай царквы другой паловы XIX ст. Храм атулены рыштаваннямі. Адноўлены ўжо адзін купал і на ім залаціцца крыж. Ахвярная скрынка стаіць ля прылаўка з гарэлкай і цыгарэтамі.

— У гэтай чарзе сумленне кранае хутчэй чым дзе, — жартуюць у магазіне. Кідаем у скрынку ўсю здачу ад пакупак.

Мясцовыя хочуць нам дапамагчы, але ім не пад сілу.

Дарэвалюцыйная, „белая" эпоха тут далёкая, як і каменны век.

* * *

Галя Элюар не вярнулася тады з мужам у Парыж. Праз год стане жонкай Сальвадора. Павянчаюцца ў 1934 годзе.

Сальвадор Далі стварае культ жонкі.

— Галя — цудоўная асоба, якую я меў шчасце сустрэць у сваім жыцці, — паўтарае. — Яна выратавала мяне ад шаленства, стала ў адной асобе музай, жонкай, бухгалтаркай.

На пачатку саракавых Далі падпісвае свае карціны „Галя — Далі". Яна — медыум і люстра яго нарцыстычнай індывідуальнасці. Вечная інспірацыя. Назве яе Галяй Рэдзівівай — ідучай крок перад іншымі.

Большасць жыцця гэтай сусветнай пары праходзіць у рыбацкай вёсцы Порт Лігат у Каталоніі. Астануцца там жыць пасля поспехаў у ЗША, калі скандальна разбагацеюць.

— Калі я гляджу на яе крадком, у час доўгіх гадзін працы, я паўтараю сабе: яна так добра намаляваная — як боскія карціны Вермеера ці Рафаэля, — прызнаецца Далі. — Калі яна выплывае далёка ў мора, я бачу з усяго твару толькі яе неразгаданую ўсмешку. Галя! Самая таемная, неразгаданая чарадзейка. Яна спрычынілася да таго, што ў маёй хворай галаве вырасла, як куст ружы, новае здароўе.

Лёс спалучае іх назаўсёды. Старэйшая на дзесяць гадоў Галя памірае у 1982 годзе, Сальвадор сем гадоў пазней.

* * *

А ў Зембіне... далей культ айчыннай вайны. У крыніцах, гістарычных апрацоўках, свядомасці жыхароў успамінаюць адно пра „Зембінскі бой". 21 сакавіка 1943 года партызаны сутыкнуліся тут з паліцэйскім батальёнам. За восем гадзін бою партызаны пры падтрымцы брыгад „Дзядзькі Колі" і „Смерць фашызму" знішчылі тры дзоты і спалілі склады з боепрыпасамі і прадуктамі. Геройства партызан бясспрэчнае, хаця ў зембінскім баі, як кажуць крыніцы, перамаглі паліцаі.

— Чысты сюррэалізм, — кідаем на развітанне мястэчку.

У магазіне жанчыны нарэзваюць нам жоўты сыр. Думаем пра хвалюючыя гадзіннікі Сальвадора Далі. Інспірацыяй для іх быў, менавіта — жоўты сыр!

Ганна Кандрацюк

Крыніцы: Сальвадор Далі, *Дзённік генія, Маё сакрэтнае жыццё.*

# Каму мяшала кірыліца?

Са сцяны Дзіцячага садка н-р 14 у Беластоку знікла шыльда.

— Летась бацькі і настаўніцы апрацавалі статут прадшколля, — кажа дырэктар Люцыя Німяровіч. — У ім запісана, што наша ўстанова польска-беларуская. Згодна са статутам, у студзені павесілі мы ля ўвахода дзве інфармацыйныя дошкі: на польскай і беларускай мовах. Польская вісіць, а беларускую хтось зняў.

Спачатку крадзяжу нават не заўважылі. Дырэктарка думала, што дошку зняў сантэхнік, каб лепш яе замацаваць, на больш салідных круках. Бацькі думалі, што дошку знялі настаўніцы, каб выправіць памылку, якая выпадкова трапілася ў шыльдзе. Праўда высветлілася ў панядзелак 9 чэрвеня, дзень пасля еўрапейскага рэферэндуму.

— У час, калі палякі выказаліся за ўваход краіны ў Еўрасаюз, такія выпадкі дрэнна сведчаць пра нас, як дзяржаву і як народ у цэлым, — гаворыць Дарыюш Дэмчук, сын якога ходзіць у садок. — Гэтага выпадку нельга тлумачыць інакш, як неталерантнасцю да мовы нацыянальнай меншасці.

Інакш гэта бачыць Люцыя Ажахоўская, начальнік Аддзялення адукацыі Гарадской управы Беластока:

— Усё часцей паступаюць да нас інфармацыі са школ пра хуліганскія ўчынкі моладзі. Гэтае здарэнне — прыклад такога ж дурнога вандалізму. Я не дашукоўвалася б тут іншых прычын.

Фота МІХАЛА КОСЦЮ

*З 1996 года побач польскіх, працуюць тут два беларусія аддзелы. Беларускую дошку фундавалі самі бацькі*

— Цяжка паверыць, што гэтая шыльда камусьці мяшала, — кажа Андрэй Алексяйчук, які дачку возіць аж з Засцянак, — але добрыя людзі гэтага не зрабілі. Яна ж толькі паказвала, што тут нават не беларускі, а польска-беларускі садок. Дзе яшчэ ў Беластоку — пра які часта чуем, што мае найбольш меншасцей з усіх польскіх гарадоў — можам убачыць сляды гэтых меншасцей? На „Ніве" і Беларускім таварыстве. Гэта ўсё. Таму думаю, што шыльда павінна вярнуцца на сваё месца.

— Мы яе зноў павесім, — дэкларуе Дарыюш Дэмчук, — бо хочам, каб наш дзіцячы садок заставаўся такім, якім ён сфармаваўся на працягу апошніх гадоў.

Дзіцячы садок н-р 14 у Беластоку — адзіны ў Польшчы, у якім дзеці вывучаюць беларускую мову. З 1996 года побач польскіх, працуюць тут два беларускія аддзелы.

Беларускую дошку фундавалі самі бацькі.

М. В.

# Царква ў Браньску

Нядаўна наведаў я Браньск. У дарозе з Бельска цікавілі мяне праваслаўныя сакральныя аб'екты ды прыдарожныя крыжы і каплічкі.

Гміна Браньск ляжыць на важным камунікацыйным шляху з Варшавы ў Белавежу, а яе ўзнікненне выпадае на 1493 год. Цяперашні горад Браньск у 1520 годзе апынуўся ў межах створанага тады Падляшскага ваяводства. Першая сусветная вайна прычыніла гораду шматлікія знішчэнні, многа жыхароў эвакуіравалася ў глыб Расіі. 24 верасня 1939 года горад занялі саветы і ўключылі ў склад БССР. У чэрвені 1941 года Браньск занялі немцы, а калі тры гады пазней адступалі, знішчылі горад і навакольныя вёскі ў 35%. Развіццё горада і гміны выпала на 70-я гады. У 1992 годзе наступіў падзел браньскага раёна на тры аддзельныя тэрытарыяльныя адзінкі: горад Браньск, гміну Браньск і гміну Рудка. Цяпер сам Браньск налічвае каля чатырох тысяч жыхароў, пераважна каталікоў; праваслаўных пражывае тут вельмі мала, хаця гісторыя тамашняга праваслаўя сягае глыбокай даўніны. Ад некалькіх гадоў у цэнтры Браньска будуецца новы мураваны, вельмі прыгожы праваслаўны храм.

* * *

Вяртаючыся да гісторыі: царква св. Сімяона Стоўпніка існавала ў Браньску ўжо ў 1558 годзе. Метрыкальныя кніжкі паходзяць з канца 19 ст. Прыход пратрываў да першай сусветнай вайны. У міжваенны перыяд аднаўлена прыход. Пасля другой сусветнай вайны браньскія праваслаўныя карысталіся духовай паслугай з прыхода Малешы; гэта доўжыцца, з невялікімі перапынкамі, па сённяшні дзень.

Як вынікае з захаваных метрыкальных кніжак, найбольш шлюбаў было ў 1894 годзе — 16, а найменш у 1944 годзе — 1; хрысцін у 1895 годзе — 56, а ў 1945 годзе — 1; найбольш сконаў у 1893 годзе — 49, у 1945 годзе — 1.

Згадваючы пра Малешаўскі прыход трэба адзначыць нестабільныя абставіны пасля другой сусветнай вайны, калі праваслаўныя вернікі эвакуіраваліся ў Савецкі Саюз або выязджалі ў гарадскія асяродкі. Царква св.св. Пятра і Паўла ў Малешах, пад якую падлягае браньская царква, існавала ўжо ў 1562 годзе, а ў міжваенны перыяд уваходзіла ў склад бельскага Прачысценскага прыхода.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

* * *

Новая царква ў Браньску яшчэ не здадзена ў карыстанне. Амаль насупраць яе — сто метраў далей — стаіць каталіцкі касцёл у эклектычным стылі, пабудаваны ў 1862 годзе. Звонку царква — хаця памерамі не найбольшая — выглядае чароўна. Ужо здалёк увагу прыкоўвае дах храма ў форме вялікага купала, на якім пастаўлены васьмігранны барабан завершаны меншым купалам з праваслаўным крыжам.

Драўляны будынак старой царквы з 19 стагоддзя (з вартым увагі аснашчэннем з 17 і 18 стагоддзяў) не прадстаўляе архітэктурнай вартасці; прылягае ён сёння да будуемага храма.

За заднім бокам храма царкоўны пляц не абгароджаны, але дапытліваму турысту і так не ўдасца свабодна і бяспечна падысці і аглянуць храмы. Чаму? Храмаў, як мне сказалі прахожыя, пільнуе чарада бездаглядных сабак; недзе ў закутках пабудовы ашчанілася сука...

Калі я падышоў бліжэй, каб зрабіць здымкі, пачуў жаночы голас:

— Proszę przyjechać jak będzie wykończone, — ахвотна і з гонарам сказала праз адкрытае акно суседка царквы.

— А колькі ў Браньску праваслаўных сем'яў і ці адбываюцца тут праваслаўныя набажэнствы? — спытаў я яе.

— Тут шэсць праваслаўных сем'яў, а набажэнствы ў старым храме служыць бацюшка, які прыязджае з Малешаў, — адказала яна мне; і я ўпэўніўся, што тут абедзве канфесіі жывуць па-Божаму.

Міхал Мінцэвіч

# Забытая вёска

Вёска Малыя Азяраны прысела на нахіленым да гранічнай ракі Свіслач касагоры, быццам клонячыся ў бок Беларусі і адварочваючыся ад Польшчы і ўсяе Еўропы. І не надта дзіўна: аддаленая вёска не змагла забрацца на той цывілізацыйны цягнік, які пагнаўся ў 21 стагоддзе, быццам асталася ў абдымках даўніны. Няма тут новых хат, адно паволі паўзе наступ руйнуючага часу, пахіляючы да зямлі ўсё тое, што там асталося.

На паўднёвым канцы вёскі стаіць праваслаўны крыж са зваротам-малітваю: „Господи! Силою Креста Твоего сохрани дер. Озераны отъ всякаго злаго обстояния. 1928 г."

Крышку далей стаіць мураваная каталіцкая каплічка (на здымку). Калісь у Малых Азяранах жыло крыху каталікоў, але амаль усе выехалі з роднай вёскі, пакідаючы толькі адну бабульку. І каплічка стала занепадаць, зарастаць усялякім кустоўем. Але прыйшоў нечаканы падратунак ад сплеценых нейкім дзівосным чынам людскіх лёсаў. Як гэта ў памежнай заняпалай зоне бывае, мясцовыя людзі сталі шукаць свой шанс у трансгранічным абмене. Каб гэта той абмен адно толькі да камерцыі абмяжоўваўся, але не заўсёды бывае такая чыстая дзейнасць; часта нешта непрадбачанага прычэпіцца... Так было і ў згаданым выпадку. Удавец з Азяран пазнаёміўся з удавой з Беларусі, якая тутэйшая родам — з Шымкаў. Ён праваслаўны, а яна каталічка, але магнетызм — супрацьлеглыя полюсы прыцягваюцца — не абмежаваны адно да чыстай фізікі. То ён паедзе да яе, то яна да яго. І менавіта яна стала парадкаваць занепадаючы помнік азяранскай даўніны, дапамагае і ён. І каплічка выглянула з кустоўя, памаладзела і зноў упрыгожыла азяранскую вуліцу...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

На паўночным канцы Малых Азяран таксама стаіць праваслаўны крыж: „Огради насъ Господи силою честнаго миротворишаго Твоего креста и сохрани отъ всякаго зла. 1908 г. 8 іл"

Абодва праваслаўныя крыжы, якія быццам у абдымкі ўзялі вёску, вычасаў быў калісь са свайго каменя майстар Зелянкевіч — для вываду пакойнікаў. Але не толькі пакойнікі пакідалі Малыя Азяраны — побач крыжоў перасмыкаліся ў шырокі свет і маладыя людзі, паволі пакідаючы сваю Малую Айчыну на волю лёсу. Звароты-малітвы на вывадных крыжах быццам не задзейнічалі...

Спытаў я вяскоўцаў, у якой хаце яны свенцяць пасху і даведаўся, што для гэтай мэты бацюшка не прыязджае ў Малыя Азяраны, а вазіць трэба ў Крынкі. І што тыя каменныя малітвы значаць, калі бадай і бацюшка забыў пра вёску?

Аляксандр Вярбіцкі

# Узнагарода за місіянерскую дзейнасць

Мітрапаліт Анастасіас (Anastasios), архіепіскап Тыраны, Дурэса і ўсёй Албаніі, які з 16 па 23 мая пабываў у Польшчы, маліўся ў Варшаве, Гайнаўцы, Беластоку, Лодзі, жаночым манастыры на Святой Гары Грабарцы і мужчынскім манастыры ў Супраслі. У час гала-канцэрта Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" быў ён узнагароджаны ордэнам „Ecce Homo", капітул якога знаходзіцца ў Асяродку рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў у Тамашове. Узнагароду мітрапаліт атрымаў за місійную і дабрачынную дзейнасць у Афрыцы і Албаніі.

Архіепіскап Анастасіас нарадзіўся ў 1929 годзе ў Грэцыі. З 1972 года, калі стаў епіскапам, займаўся праваслаўнай місіяй у Афрыцы. Вёў актыўную дзейнасць у „Сіндэсмасе" — Сусветным брацтве праваслаўнай моладзі. З 1992 года кіруе Албанскай праваслаўнай царквой. З'яўляецца ганаровым доктарам шматлікіх замежных навучальных устаноў.

Мітрапаліт Анастасіас расказаў пра пасляваенныя праследаванні хрысціян у Албаніі. Пасля вайны разбурылі ў гэтай краіне каля 1 600 цэркваў, а ўлады забаранялі вернікам маліцца. На месцах храмаў будавалі гатэлі і жыллёвыя дамы. Грамадства стала ў вялікай ступені атэістычным. Спачатку мітрапаліт служыў Літургіі на плошчах, лугах і ў палатках. Пасля пачалі рамантаваць знішчаныя цэрквы і будаваць новыя. Разам адрамантавалі і прывялі ў карыстанне 260 храмаў і збудавалі 80 новых цэркваў. 122 асобы рукапалажылі ў свяшчэннікаў, пачалі выдаваць праваслаўныя газеты і трансляваць праваслаўныя перадачы па радыё.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*У Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы 18 мая Святую літургію служылі мітрапаліт Анастасіас і мітрапаліт Сава*

— Наша царква не зачыняецца для сабе. Мы працуем для ўсяго грамадства Албаніі. Займаемся лячэннем хворых, адукацыяй грамадства, сельскай гаспадаркай і аховай асяроддзя. Будуем дарогі і кладзем водаправоды, — заявіў мітрапаліт Анастасіас. Гаварыў ён пра неабходнасць паяднання з албанцамі непрыхільнымі для праваслаўных вернікаў і заклікаў да аховы прыроды. У час выступлення ў Гайнаўцы мітрапаліт Анастасіас прапанаваў ісці складанай дарогай, якую паказаў Хрыстос.

Аляксей Мароз

# Перад Богам стае не з пустымі рукамі

28 мая развіталіся мы з Мікалаем Нестаровічам, адным з вядучых у Польшчы кінааператараў-дакументалістаў, шматгадовым супрацоўнікам Польскага тэлебачання. Памёр ён 25 мая ў варшаўскім шпіталі ва ўзросце 62 гадоў. Да канца свайго жыцця аставаўся верным паклоннікам Беластоцкай зямлі ды праваслаўнай грамадскасці і гэтыя тэмы дамінавалі ў яго фільмах.

Памінальнае набажэнства адбылося рана ў царкве св. Іаана Лесвічніка на варшаўскай Волі. Каля 15 гадзіны пахавальная калона з пакойнікам і жалобнікамі прыбыла ў Орлю. На сустрэчу выйшла многа арлян са святарамі а. Рыгорам Місіюком з Беластока і арлянскім настаяцелем а. Аляксандрам Такарэўскім.

Паніхіду ў могільнікавай царкве св.св. Кірылы і Мяфодзія адслужыў а. мітрат Аляксандр Такарэўскі. Прыгадаў ён коратка жыццё пакойніка, выказаў спачуванне ягонай сям'і і прасіў шчыра маліцца за спакой яго душы.

Ліцію над магілай адслужыў а. Рыгор Місіюк, які сказаў м.інш.:

— Усім, хто ведаў пакойнага Мікалая, сардэчна спачуваем. Усім удзельнікам памінальнай урачыстасці, усім хто выказаў спачуванне сям'і і пашану пакойніку — сардэчнае дзякуй. Сёння мы зведалі асаблівы дысананс: ад гарадскіх могілак на варшаўскай Волі пры руховай вуліцы, дзе словы малітвы перапляталіся з гулам праязджаючых трамваяў, да схіляючай да задумення балючай цішыні тут, дзе птушкі бесперашкодна спяваюць Богу свае песні. І ўсё гэта складваецца на наша жыццё, напаўняе зместам слова „цывілізацыя", дзе кожны знаходзіць сабе месца. Пакойны Мікалай, з якім сёння развітваемся, ставіў перад сабою высакародныя мэты і за гэта многія схілялі перад ім галовы, многія бачылі ў ім прыклад для наследавання ў жыцці, яшчэ іншыя мо і дзівіваліся: дзеля чаго ён так любіць гэты пясок падляшскай зямлі, чаму так ахвотна сюды прыязджае, чаму з такім захапленнем пра яе расказвае? І тое здзіўленне цяжка выказаць словамі — усім тым трэба было напоўніць жыццё — і ён гэтым жыў! Ніколі не саромеўся самога сябе, сваёй сям'і і таго, што лічыў свяшчэнным, ды паводзіў сябе так, каб і іншыя шанавалі ягоныя святасці. Дзякуй яму за тое. Таму ён сёння стае перад Богам не з пустымі рукамі. Калі мы тут сёння згаварыліся, што яму было толькі шэсцьдзесят два гады, нехта сказаў: „Хіба ў небе не хапала аператара". Не ведаю, ці ўсе ўсведамляюць боль гэтых слоў. Бо Богу непатрэбна каб хто фільмаваў наша жыццё, каб пасля, калі станем перад Страшным судом, мы ўбачылі недарэчнасць нашых намаганняў. Але тыя пакуты, тая хвароба, якая абяссіліла Мікалаева цела, мабыць, схіліла Бога рашыць: „Дастаткова, што ты насіў камеру на плячах, дастаткова, што ты насіў любоў у сэрцы! Не хачу, каб ты гаварыў, што ўжо не жывеш, толькі вядзеш расліннае жыццё — прыйдзі туды, дзе Я нарыхтаваў табе месца, дзе няма ўжо болю, хвароб, пакутаў — адно вечнасць".

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Мікалай Нестаровіч на яўрэйскіх могілках у Орлі, 2000 г.*

У паховінах Мікалая Нестаровіча ўдзельнічала некалькі соцень чалавек — знаёмых і суседзяў, сяброў і супрацоўнікаў, якім адкрываў гэтую малавядомую ў Польшчы зямлю і культуру. Ён супрацоўнічаў з выдатнейшымі творцамі польскіх дакументальных фільмаў: Тамарай Саланевіч, Эвай Бажэнцкай, Вальдэмарам Карватам і Анджэем Фідыкам. Усе яны падкрэслівалі яго прафесійнае майстэрства і бязмежную ангажаванасць у рэалізацыю карцін.

Хаця сёння Мікалая няма ў жывых, жыве ён і жыць будзе праз ягоныя фільмы. Ён аб'ездзіў амаль увесь свет, а ягоныя творы „Кіношнікі з Калькуты", „Арызона", „Парад" яшчэ пры жыцці аўтара сталі класікай еўрапейскага дакументальнага фільма. Астаўся і яшчэ незакончаны фільм пра Орлю і яе жыхароў, у рэалізацыі якога ўдзельнічаў і я. Было яшчэ многа планаў для здзяйснення...

Міхал Мінцэвіч

# Сцежкі-дарожкі

Ян Кулік нарадзіўся 7 студзеня 1926 года ў вёсцы Грабавец каля Дубіч-Царкоўных у беднай сям'і. Частым госцем у доме ягонай сям'і быў голад, ды і секвестратар часта наведваў Івана Куліка, бацьку нашага героя, за незаплачаныя падаткі. Ян падрастаў, разрасталася і сям'я. Найстарэйшы брат Майсей дапамагаў ужо бацьку на гаспадарцы, а Ян хадзіў у дубіцкую школу, дзе пры санацыі скончыў чатыры класы, а пры саветах пяты клас. Бацька Яна, Іван, быў адукаваным чалавекам, бо пры цары вучыў грамаце дзяцей у суседняй вёсцы Елянка; меў ён вельмі прыгожы почырк. Зараз пасля Яна ў сям'і Івана і Лізаветы Кулікаў нарадзілася дачка Таццяна, а ў 1932 годзе сын Сяргей. Яшчэ перад нараджэннем Сяргея бацька Іван захварэў на шчытападобную залозу, завезлі яго фурай у шпіталь у сам Беласток. Аднак адратаваць Івана ад смерці не ўдалося, хаця на лячэнне пайшлі немалыя грошы. Маці Лізавета не ўпала духам і выхавала дзяцей на сумленных людзей.

Калі настаў час нямецкай акупацыі, у Грабаўцы была ўстаноўлена новая ўлада. Солтысам быў абраны Міхал Данілюк, які верна служыў немцам. У маі 1942 года ён вызначыў групу з шасці маладых хлопцаў і дзвюх дзяўчат на прымусовую працу ў Нямеччыну. З сям'і Кулікаў быў вызначаны найстарэйшы брат Майсей, аднак Ян падмяніў яго. Маладых людзей завезлі фурамі з Грабаўца на чыгуначную станцыю ў Кляшчэлі. Там нямецкія канваіры збівалі дубінкамі савецкіх ваеннапалонных салдат і нашы „навабранцы" гледзячы тое плакалі, спадзяючыся, што і з імі тое самае зробяць. Завезлі іх у быдлячых вагонах у Бельск і загналі ў асобы лагер, дзе часта білі іх за найменшую правіну ці нават за тое, што не так, „як трэба", глянуў хто на немца. У Бельску трымалі іх тыдзень, а пасля, зноў у быдлячых вагонах, завезлі ў Прусію, у горад Тыльзіт над Нёманам (сёння Савецк у Калінінградскай вобласці).

На станцыі ў Тыльзіце размеркавалі прымусовых работнікаў і павезлі поездам у напрамку Кёнігсберга. На кожнай станцыі высаджвалі па некалькі чалавек і высылалі назначаным гаспадарам. Яна Куліка і мо яшчэ з дваццаць іншых хлопцаў высадзілі на станцыі Кройцынген і там іх паразбіралі паасобныя гаспадары. Яна Куліка ўзяў Пауль Шафлер з вёскі Говартэн. Гаспадар меў 80 моргаў зямлі, гэта каля дваццаці гектараў. Ягоныя чатыры сыны былі на фронце; адзін з іх ужо загінуў, другі пасля ранення стаў інвалідам і вярнуўся, калі Ян ужо там працаваў. Ды і апошнія два сыны наўрад ці вярнуліся з вайны.

Гаспадар быў дрэнным чалавекам, не меў спагады да сваіх работнікаў і слаба іх карміў. Гаспадарыў, аднак, ён добра, меў уласны гусенічны трактар і добрыя будынкі. Трэба было цяжка і пільна працаваць цэлае лета і восень, а зімою даглядаць дабытак. Настаў 1943 год, Ян працаваў горш як палонны. Восенню, калі ён паіў кароў, нешта гаспадару не спадабалася і ён стаў лупіць Яна кастылём. Ян не стрымаў, ухапіў немца за горла і амаль не задушыў, але іншыя работнікі развялі іх. На другі дзень прыехаў паліцай і гаспадар адправіў Яна ад сябе.

Ян Кулік трапіў у мястэчка Дзялдова ў лагер, дзе прабыў два тыдні, а пасля завезлі яго на захад Германіі, у горад Хаген каля Дортмунда. Там яму давялося працаваць на металургічным заводзе пры выліўцы жалеза і сталі. Есці давалі па 50 грамаў хлеба ў суткі, літр супу і бручку. 1 студзеня 1944 года Ян пакалечыўся ў выпадку пры працы: цяжка пабіў тры пальцы, адзін з іх цалкам адляцеў. Тры тыдні лячылі ў шпіталі і яшчэ восем тыдняў быў на бальнічным. Пасля Ян зноў вярнуўся ў ліцейны завод на сваю ранейшую працу.

Калі з усходу набліжаўся фронт, Яна і іншых работнікаў зноў павезлі поездам ва Усходнюю Прусію да ранейшых гаспадароў. Аднак працавалі ў іх коратка, мо з тыдзень, бо пасля натоўпамі ў тысячы чалавек пагналі іх на тэрыторыю Літвы капаць акопы. Гэтая цяжкая праца доўжылася каля трох летніх месяцаў і адтуль некаторыя работнікі, у тым ліку і Ян, уцяклі да сваіх ранейшых гаспадароў. Наступала восень, гаспадары пазбаўляліся свайго дабытку, каб не папаў ён у бальшавіцкія рукі. Малацілі толькі збожжа, якое фурамі адвозілі на станцыю і адтуль паязадамі вывозілі ўглыб Нямеччыны. Працавалі так да студзеня 1945 года. Немцаў асталося мала, бо паўцякалі са сваім багаццем і толькі адзінкі кіравалі малацьбой і вывазкай ды канваіравалі прымусовых работнікаў.

З фронтам тысячы нямецкіх салдат адступалі на захад і 18 студзеня ўвайшлі саветы. Байцы сказалі Яну і іншым, каб уцякалі, бо можа быць вялікі бой. Пасля, аднак, новыя ўладары, следчыя НКУС, у мястэчку Віштынец каля колішняй літоўска-пруская мяжы праз трое сутак, мо з трыццаць разоў, дапытвалі групу Яна. Не палічылі іх уласаўцамі і ворагамі народа і запрапанавалі служыць у савецкай арміі; іншай альтэрнатывы не было. Тая часць, у якую трапіў Ян, ішла з баямі на захад. З горада Коршы іх адправілі ў 208 пяхотны полк і пасля кароткага вайсковага абучэння адправілі на фронт. Наш герой застаўся ў жывых, але пад Кёнігсбергам загінула столькі людзей, што не пералічыць. Канец вайны засціг Яна Куліка ў горадзе Пілаў. Пасля былі яшчэ Беларусь і Расія і дамоў вярнуўся ён у жніўні 1947 года; дома ўсе былі ў жывых. Пасля Ян стаў на працу ў Дубіцкай гміне, а ў 1963 годзе пайшоў у Дубічы-Царкоўныя ў прымы, ажаніўшыся з Марыяй Хіліманюк; у іх двух сыноў. Сёння Ян Кулік пенсіянер і старшыня Кола ваенных ветэранаў у Дубіцкай гміне.

Мікалай Панфілюк

# Помнік салдату

У Рэпчычах пры дарозе, непадалёк чыгуначнай лініі Чаромха — Беласток знаходзіцца помнік устаноўлены савецкаму салдату Івану Зялёнаму, загінуўшаму ў ліпені 1944 г. Калісьці я чуў, што гэта несапраўднае прозвішча. Паспрабаваў я высветліць справу. Грыша Янушэк, жыхар Рэпчычаў, сказаў такое: — Марыя Піліпаўна Паўлючук і Рыгор Каравай казалі, што сапраўднае прозвішча загінуўшага Уладзімір Зелянцоў. Так назваў загінуўшага сябра, які прыйшоў за мяшком да Рыгора Каравая, які спатрэбіўся для пахавання забітага. Мемарыяльную дошку з надпісам устанаўляла гміна. Як кажуць кляшчэлеўскія гмінныя чыноўнікі ніякай памылкі быць не можа, бо прыязджала сястра загінуўшага салдата на магілу і пацвердзіла аўтэнтычнасць даных. Так, ці інакш, магіла знаходзіцца ў належным стане, а заслуга гэта гміны і жыхароў вёскі.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Уладзімір Сідарук

# Сустрэча са зладзеямі...

Поўдзень, чацвер 29 мая 2003 г. Пахадзіў я крыху па рынку і прыйшоў на аўтобусны прыпынак. Хачу пад'ехаць да Міхайлаўскай царквы, адпачыць у цяні. Усюды жара-спякота. Купіў я ад жанчыны з Роўна газету „Сільскі вісті". Чытаю: „Худоба гине з голоду..." Дрыжыкі прайшлі па маім целе. Перад вачыма ўстаў суд нада мной. Я быў працаўнікам знішчання меліярацыяй балот, вадаёмаў і рэчак. На судзе былі: меліяратары, вучоныя-біёлагі ды сакратар ПАРП Ляскоўскі.

У канчатковай фазе судаводства ўзяў слова старшыня Прэзідыума Ваяводскай рады Шчэнсняк: „Што дамо яму (Рудкоўскаму) за ягоную нахабнасць і абразу вучоных — назваў усіх невукамі...". Пасля ўсяго магістр юстыцыі, Багдан Залеўскі сказаў: „Вы, таварышы-меліяратары ды вучоныя не абверглі прагнозу інж. Рудкоўскага, што будзе суша, страшлівая спякота і ўсё павыгарае... Таму прапаную пераглянуць гэтую справу праз 40-45 гадоў...". Усе былі згодны.

Толькі адно але. Час ідзе ды ўсё змятае на сваім шляху. Астаюся неапраўданым... Пераглянуць маю справу ўжо немагчыма. Нікога няма ў жывых. Дык засталася праўда: усё выгарае, на Украіне гіне дабытак...

Адлажыў я газету, сяджу, як баран у агарожы... Спякотна. І вось у дарожнай затоцы затрымаўся аўтамабіль. Адкрывае дзверы жанчына. Махае рукою, каб хтосьці падышоў да яе. Падыходжу я. У легкавушцы іх трое: дзве жанчыны ды шафёр — буцматы, круглатвары, прысадзісты... На заднім сядзенні жанчына, белая хустачка на руцэ. Павязка так была дрэнна зроблена, што адкрывала цела (здаровае, раны не было). Усе трое на тварах асмалены, быццам толькі што выйшлі з капцілкі; да таго, жанчына, якая мяне клікала, мела твар, быццам чэрці гарох малацілі... У руках трымала лісток паперы, на якім велізарнымі буквамі-каравыламі было штосьці напісана. Зразумець я нічога не мог — ні ладу, ні складу... Урэшце жанчына пытае мяне: „Ведаеце вы па-нямецку?" — Ведаю толькі слова gut, больш нічога... Даведаўшыся, што я ў нямецкай мове непісьменны, пачала: „Мы з Дрэздэна... З намі здарылась... Нас ударыў „TIP"... Бачыце, вунь сядзіць у задзе... Бачу... толькі — sagen sie mir bitte woher Sie sind?!. Und, was wollen Sie? (скажыце вы мне, будзьце ласкавы, адкуль вы, ды што хочаце), — сказаў я ім па-нямецку. Тут гэта „немка" нічога не зразумела, паўтарала: памажыце нам, хочам да вас дадому. Там нашу хворую паложым на тапчан... Вам дамо грошы купіць нам хлеб, кансерву і напітак... Мы па дарожнай катастрофе... (так, але ўсе жывыя, цэлыя і машына таксама).

Добра. Едзем. У мяне вельмі бедна. Жыву ў прыбудоўцы... Тут машына рванула і яны хуценька ад'ехалі.

А шкада. Каля Міхайлаўскай царквы, як рэліквія, астаўся куратнік. Калісьці да бацюшкоў прыносілі курэй, качак, гусей. Там іх замыкалі, чакалі прыгавору на смерць... Я жадаў запрапанаваць ім адпачынак на старым парваным матрацы з клапамі, а сам — пазваніць у паліцыю...

Няхай прачытаюць усе, пакуль не позна і не абакралі іх да тла...

Барыслаў Рудкоўскі

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

# Помнік XX стагоддзя

Аб чыгуначным прыпынку ў Кляшчэлях „Ніва" пісала амаль год таму. Ці штосьці перамянілася з таго часу ў Кляшчэлях? 23 мая г.г. падарожнічаў я ў Беласток у кампаніі Уладзіміра Ефімюка, чыгуначнага машыніста. Калі спыніліся мы ў Кляшчэлях, дык нашы вочы асляпіў бляск з перона. Паглядзелі ўбок. Уваходныя дзверы ў пачакальню былі забіты лістамі пліты, а вокны — новенькай цынкавай бляхай.

— Гэта на тым тыдні зрабілі, — паясніў сябра. — Коля Савіч рабіў гэта.

На паверсе ў вокнах віднелі беласнежныя фіраны. Жывуць там людзі.

— Калі прызначалі чыгуначнікам кватэры ў жылых корпусах у Бельску, — гаварыў мой спадарожнік, — дык кватаранты з кляшчэлеўскай станцыі пісалі, што ў іхніх памяшканнях грыб разводзіцца. Прасілі прызначыць ім новыя кватэры ў блёку. Чыгуначная санэпідэмстанцыя пацвердзіла гэта. — Заараз пэўна грыб прапаў, — жартаваў машыніст, — бо людзі зноў жывуць.

Па аргументацыі кіраўніка поезда, які з намі ехаў, новенькая бляха на кляшчэлеўскай пачакальні стане здабычай зладзеяў. Калі раней печку разабралі ў пачакальні, дык і новенькая бляха прыцягне аматараў таннай здабычы. Аб чым думалі начальнікі беластоцкай чыгункі, адбіраючы падарожным дах над галавой? Аб эканоміцы, каб у пачакальні не прыбіраць? Што на гэта бурмістр Кляшчэляў?

Будынак пачакальні занесены ў спісак помнікаў архітэктуры XX стагоддзя. Памойму, такая візітная картачка кляшчэлеўскай пачакальні не прынясе гораду славы. Пачынаецца летні сезон, трэба спадзявацца прыезду турыстаў над Рэпчыцкае вадасховішча. Дзе яны схаваюцца ў час дажджу? Пад раскідзістымі дрэвамі, ці ў кватарантаў на гарышчы?

Уладзімір Сідарук

# Слаўны верш

Хаця здаўна я не п'ю гарэлкі, але чамусьці слаўны верш Мікалая Краўчука п.з. „Гарэлка", што калісьці друкаваўся ў „Ніве", я не забыў. Мо гэта сталася так таму, што ў маладосці дэкламаваў я яго на памяць на розных пастаноўках у сваёй святліцы і далей. Некалькі гадоў таму мой сын, які пражывае ў Беластоку, нечакана пазнаёміўся з нашым слаўным Краўчуком, хаця адзін аднаго не зналі. Аднак хапіла пачуць прозвішча Панфілюк і незнаёмы спытаў майго сына:

— А мо вы знаёмы Мікалая Панфілюка?

— Гэта мой бацька, — адказаў мой сын.

Сын з маіх апавяданняў ведаў, кім з'яўляецца спадар Краўчук, і спытаў яго, чаму ён не піша сваіх вершаў у „Ніву".

— Слаўны час пайшоў у забыццё, а і натхнення няма, — адказаў яму паэт.

Шкада вельмі, і мая просьба да Мікалая Краўчука, каб адгукнуўся — калі яшчэ жыве — на старонках „Нівы" і аднавіў пісанне сваіх цудоўных сатырычных вершаў. Прыгадваю змест згаданага верша Мікалая Краўчука.

Мікалай Панфілюк

## *Гарэлка*

*Людзі кажуць: водка, водка.*
*Няўжо яна ім салодка?*
*Як яна мне пракудна,*
*Што сказаў нават: трудна.*
*Хто гарэлку ўспамінае,*
*То мяне аж страсанае.*
*Я аднойчы насмактаўся,*
*Што на вуліцы валяўся,*
*Рваў рукамі свае грудзі*
*І крычаў: Ратуйце, людзі!*
*Людзі беглі як на дзіва,*
*Прынеслі мне квасу, піва*
*І кіслога малака.*
*Я кішкі прапалакаў*
*І сказаў: Як буду жыці,*
*Водкі больш не буду піці,*
*Каб ніхто больш не смяяўся,*
*Што я гары налізаўся.*
*Устыдна у дваццатым веку*
*Маладому чалавеку*
*Гэтак моцна нахляптацца*
*І на вуліцы валяцца.*
*Раджу вам, маім сябрам:*
*Водка — гэта не вада!*
*Адрачыцеся яе піці —*
*Можна й без яе пражыці.*

*Мікалай Краўчук*

# Фільму перашкодзіла недарэчнасць

Фільму „Анастасія Слуцкая", што здымаецца на „Беларусьфільме", перашкодзіла недарэчнасць. Ад вялікай цеплыні на здымачнай пляцоўцы згарэла палова абсталявання і дэкарацый. Дрэва, з якога былі пабудаваны замак і дэкарацыі, было насычана гаручымі матэрыяламі, каб прыдаць ім выгляд старажытнасці.

Афіцыйная прэм'ера фільма прымяркоўвалася да дня незалежнасці — 3 ліпеня. Паказ фільма хутчэй за ўсё будзе перанесены, аднак першыя гледачы ўжо ёсць — гэта сябры мастацкай рады кінастудыі „Беларусьфільм", якія 5 чэрвеня бачылі ў мінскім кінатэатры „Кастрычнік" так званую нулявую копію фільма.

Андрэй Мялешка

## Аб'ява — праца

Шукаю жанчыну з Падляшша да хатняй работы 30 км ад Варшавы. 400 зл./месяц + кватарунак + харчаванне; тэл. (0)507 152 751.

# Выставы ў Белавежы і Гайнаўцы

Белавежскі нацыянальны парк запрашае на пасляконкурсную выстаўку пад загалоўкам „Мы можам дапамагчы нашым паўзунам". Фатаграфічная экспазіцыя працуе ў Асяродку прыродазнаўчай адукацыі БНП, ад панядзелка да пятніцы ў гадзінах 9-16.

* * *

Гайнаўскі дом культуры адкрыў 6 чэрвеня выстаўку „Настроі малога мястэчка", якую падрыхтавалі члены гуртка мастацкай тканіны „Габелен" пад кірункам інструктаркі мастацтва Зінаіды Якуць.

Выстаўку можна глядзець да 30 чэрвеня г.г. у кавярні ГДК кожны дзень (апрача панядзелкаў) у гадзінах працы Дома культуры.

(яц)

**Ніва** ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Мірановіч.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (0 10xx 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

***Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.***
**Галоўны рэдактар:** Віталь Луба.
**Сакратар рэдакцыі:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

# Н!ўка

*Джаз — спараджэньне капіталістычнага пекла*

## Ударнік

Толькі людзі пачцівага веку ведаюць ці цьмяна памятаюць, што такое *ўдарнік*. Тлумачальны слоўнік беларускае мовы, выпушчаны за савецкім часам, тлумачыць: „перадавы работнік сацыялістычнае вытворчасьці, які перавыконвае нормы".

*Ударнікі* былі на заводах, у калгасах, нават у літаратуры былі паэты-*ўдарнікі*. Ударалі па бездарожжы, па бескультур'і. Чым і па чым ударалі — гэта было няважна. Галоўнае — каб былі ўдары.

*Ударнікам* яшчэ называлася частка затвора агнепальнай зброі, прызначаная для ўдару па капсулі патрона.

Пра джазавага *ўдарніка* размовы быць не магло. Джаз — спараджэньне капіталістычнага пекла.

Такую аскоміну набілі *ўдарнікі* працы, што ў народзе кпілі весела: „размах рублёвы, а ўдар храновы".

З раніцы да зьмярканьня па радыё гучала: „ідуць, ідуць *ударнікі* камуністычных брыгад, прад імі адкрываецца шырокі далягляд". Лірыка — падай і рыдай.

У той час было такое віно „Санцадар", мацнейшае за сонечны ўдар, дык і сьпявалі: „Не праходзіць дзень бяздарна. Санцадарна — дужа ўдарна. Мы ўсе *ўдарнікі* — мы санцадарнікі". Так сьпявалі мы ў цёплых студэнцкіх кампаніях.

Рыгор Барадулін
(паводле часопіса „ARCHE", 7/2000)

## Адгаданка

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |

### Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. японская барацьба вольнага стылю =
23 __ 15 __ 9 __ 11 __ 14 __;
2. жонка Адама =
16 __ 3 __ 12 __;
3. ручны млын для пераціраня зерня на муку =
18 __ 19 __ 13 __ 8 __ 22 __;
4. Іван, савецкі маршал, які ў канцы другой сусветнай вайны камандаваў 1 Украінскім фронтам =
6 __ 24 __ 1 __ 2 __ 10 __;
5. адзінка вымярэння або дзеянне для ажыццяўлення нейкай задачы =
25 __ 4 __ 5 __ 17 __;
6. грашовае выражэнне вартасці тавару =
21 __ 26 __ 20 __ 7 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

### Рашэнне адгаданкі з 18 нумара

**Кваснеўскі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

## Вяртанне да каранёў

— Вяртаемся да каранёў, — прамовіў мядзведзь Сандар Жоржавіч, пачынаючы на паляне апошні перад канікуламі сход уселяснога кіраўніцтва. — Хай наша лясная брацыя наблізіцца да каранёў.

Лань Гаўрусіха не зразумела і, як звычайна, затрэсліся яе путавыя костачкі:

— Як гэта так — да каранёў? — прашаптала.

— Чаго?! — зароў мядзведзь, недачуваючы.

— Да каранёў?.. — ужо гучней, ды ўсё ў дрыжыках, дапытвалася Гаўрусіха. — Я таксама да каранёў...

— Да каранёў, да каранёў, — радасна паўтараў, бы той папугай з заморскага бушу, дзік Свіналыч. І падумаў: — Урэшце змагу паказацца!

— Ціхамнетут!!! — загадаў Сандар Жоржавіч. — Зноў не цяміце. „Да каранёў", гэта такая метафара.

— Значыць та, та, та, такая прылада, — заікнулася, саскокваючы з дуба, вавёрка Кацюша.

— Ай, дурная ты вавёрка, дурная, — прабаваў супакоіцца мядзведзь.

Рэшта кіраўніцтва злосна захіхікала.

— А вы чаго хіхікаеце?! Вы таксама не такія ўжо разумакі! — рашуча кінуў Жоржавіч.

На паляне запанавала ціш.

— Справа не ў рыцці ці іншым дзюбдзянні дрэвакаранёвым, але ў сэнсе большым, агульналясным. Дайшло да мяне... — мядзведзь лыпануў слепаком на дзятла Стукача. — Дайшло да мяне, што лясная брацыя не толькі каштанамі ці падлай жыць хоча, але трэба ёй вышэйшых каштоўнасцей, вышэйшых, паўтараю. Асабліва таму, што ўсё цяжэй з падлай, а і каштаноў з кожным годам усё меней ды меней...

— Але ж карані не высока, а ў доле, — заўважыў Свіналыч.

— Маўчаць! — зноў узлаваўся мядзведзь. — Справа ў тым, што брацыя хоча старых часоў, быццам тады лепш было. А калі брацыя хоча, дык будзе тое мець. Найперш зменім тое-сёе, каб не так адразу ўсё, бо і так гэта не ўдасца. Пачнем ад сябе.

— Каб толькі не загадаў абрэзаць маю кіту! — падумала ў страху вавёрка.

Мядзведзь працягваў:

— Пачнем з нашай паляны. Ужо не будзе звацца Палянай свежага дыху, але дам ёй вышэйшы сэнс, значыць, больш важкі. Будзе зноў, як калісь, насіць імя нашага прадзеда і правадыра колішняй супольнасці брацыі тых і гэтых.

Лань Гаўрусіха і вавёрка Кацюша ўздыхнулі з палёгкай. Затужыў крыху дзік Свіналыч.

— От, і зноў не мая пара, — задумаўся.

Мядзведзь вярнуўся ў сваю бярлогу, а рэшта кіраўніцтва разышлася па лесе, абдумваючы рашэнне Жоржавіча. На паляне застаўся толькі дзяцел Стукач. Азірнуўся навокал. Пераканаўшыся, што нікога няма, пераляцеў на самавітую бярозу на ўскрайку паляны ля ўзлеска. Паціхеньку адстукаў шыльдачку з надпісам „Паляна свежага дыху":

— Можа яшчэ калісьці прыдасца.

Зараз пасля паляцеў з шыльдачкай у сваё дупло, дзе схаваў яе ў вядомай толькі сабе скрытцы-нявідцы, у якой з кожным днём было ўсё менш месца.

МакХолад

## „Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Пасля смерці багацея ягоная сям'я прыйшла да натарыуса раскрыць запавет. Юрыст адкрыў канверт і чытае: „З поўнай самасвядомасцю цэлае сваё багацце я прагуляў да смерці".

* * *

— Выбачайце, ёсць у вас запалкі?

— Не, але ёсць запальнічка.

— Ну, такой вялікай дзіркі ў зубах то ў мяне няма.

* * *

Лекар абследуе старэчу:

— Колькі вам гадоў?

— Восемдзесят пяць.

— І хопіць, дзедку!

* * *

— Чаму ў цябе такі апухлы твар?

— Быў у дантыста.

— І сколькі вырваў?

— Семсот злотаў.

* * *

— Скажыце, пан доктар, ці заўсёды так вам удаецца вырваць зуб без болю?

— Ой, не! Учора звіхнуў сабе руку.

* * *

У стаматалагічны кабінет на дамоўлены візіт ідзе бледны ад страху Андрэй.

— Вельмі мне прыкра, — спыняе яго медсястра, — але сёння доктар адсутнічае.

— А ці можаце мне сказаць, калі яго зноў не будзе?

* * *

— Што такое медыцына?

— Гэта такая навуковая дысцыпліна, якая хвораму дапамагае перайсці на той свет.

* * *

Пасля працяглага абмеркавання наступнай аперацыі адзін з хірургаў дастае з кашалька манету і кажа:

— Калі выпадзе рэшка, аперыруем ныркі, калі герб — сэрца.

* * *

Загадчык аптэкі знаёміць маладога фармацэўта з месцам працы.

— Што знаходзіцца ў гэтай шафе? — пытае навічок.

— Тут трымаем лекі, якія прадаем хворым тады, калі не зможам прачытаць рэцэпт.

* * *

— Ці гэта праўда, што варожка гаварыла пра хуткую смерць тваёй жонкі?

— Ну, яна сказала, што ўжо неўзабаве дачакаюся лепшых дзён.

* * *

Удава пытае лекара:

— Скажыце мне, якія былі апошнія словы майго мужа.

— Уміраючы паспеў яшчэ сказаць: „Маруся, заплаці лекару сколькі захоча; ён да канца так цудоўна апекаваўся мною".

## Узнагароды...

... за правільны адказ на ***11-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Эмілія Антасюк** з Дубіноў, **Аляксандр Дабчынскі** з Беластока, **Барбара Якубюк** з Гайнаўкі.

ISSN 0546-1960